Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

На Сакольшчыне ☞ 9-10

Гарыць Краснае Сяло ☞ 3

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 39 (2785) Год LIV | Беласток, 27 верасня 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

У Адрынках адрадзіўся манастыр

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

— Сёння мы запальваем духоўную лампаду, якая павінна гарэць і даваць вялікае святло для навакольнага свету і нашых людзей, і яна павінна даваць святло не толькі для нас саміх, яна павінна даваць святло цэламу свету і ўсім людзям на зямлі, — сказаў ва ўрачыстай пропаведзі мітрапаліт Сава.

Падзею ў Адрынках першаіерарх назваў цудам на меру XXI стагоддзя, а архімандрыта Гаўрыліа — любімцам Госпада Бога і героем духу. Гаючых слоў першаіерха чакалі тысячы вернікаў з сакавіка мінулага года. Прыгадайма, супрасльскі архімандрыт Гаўрыіл з-за жадання астацца са сваім народам быў вымушаны пакінуць лаўру.

На вячэрню ва ўрочышча Кудак каля Адрынок прыехала паўтысячы паломнікаў. Архімандрыт Гаўрыіл зіхацеў ад радасці. З кожным вітаўся, гаварыў добрае слова. Запрашаў на пачастунак пасля багаслужбы, які згатавалі ягоныя *анёлы*. Многія яго анёлы паказаліся ў беларускіх касцюмах:

— Айцец Гаўрыіл папрасіў, каб мы адзелі нашы беларускія строі, — кажа спявачка з калектыву „Журавінкі" з падбеластоцкіх Агароднічак. Беларускія кашулі апранулі і харысты з прыманастырскага хору ў Супраслі. Яшчэ да вячэрні, перад каплічкай святога Антонія Пячэрскага, разам з паломнікамі заспявалі яны старажытны беларускі гімн: *Вера наша, вера слаўна, вера наша праваслаўна!*

Гімн пасля паўтысячагоддзя зноў пачула прыпушчанская зямля. Астравок Кудак адыграў сваю гістарычную ролю ў захаванні праваслаўя. У пачатку 17 стагоддзя тут, у скітах, хаваліся манахі з Супраслі, Вільні, Берасця, якіх пераследавалі з-за непрыняцця Берасцейскай уніі. Іх духоўнаму подзвігу спрыяла дзікая прырода, якая і сёння ўражвае стыхіяй.

— Як тут прыгожа! — замест „дзень добры" гаварылі сабе людзі. Многія з іх выправіліся новай кладкай, якую таксама пабудавалі архімандрытавы анёлы, над раку. Над вадой я прыслухалася аповеду сялянак пра візіт маці архімандрыта ў „пустэльню". Жанчына мела заламаць рукі і заплакаць, калі пабачыла гэтыя карчы з ваўкамі! Боль маці дарагога ім архімандрыта жанчыны, як праўдзівыя хрысціянкі, жадалі ўзяць на свае плечы, раздзяліць яго між сабою. На кожным кроку сутракаліся свае людзі. Я адчувала дадатковую асалоду — разам была мая мама, брат ды ўдавіцы з вёскі Соня і Оля. Тут мы спаткалі ячшэ былую суседку Ірку, якая з сынамі прыехала з Гайнаўкі. Гістарычная падзея ў Кудаку паспрыяла нашым сваяцка-суседскім сувязям.

* * *

У сонечны дзень святога Антонія Пячэрскага, 15 верасня г.г. у Адрынках сабралася паўтары тысячы вернікаў, каб разам з мітрапалітам Савам асвяціць зямлю пад новы мужчынскі манастыр. З аднаго Беластока прыехала сем аўтобусаў з паломнікамі. Прыбылі вернікі ад Нарвы, Міхалова, Заблудава, Гайнаўкі, Орлі, Бельска, Супраслі. Са старой парафіі архімандрыта прыбыў прыманастырскі хор.

У восем гадзін жыхары Адрынок выйшлі сустракаць мітрапаліта.

— Мы такія рады, што не расказаць, — кажа дзевяностагадовая Вольга Вайкоўская з Адрынок. — Людзі як могуць дапамагаюць нашаму Гаўрыілку.

Старжылка са слязамі вітае ідэю адраджэння манастыра. Усю літургію яна выстаяла на кастылях, у болю.

— А ўжо найбольш цешацца нашы дзеці, — дадае Вольга Вайкоўская. — Прыедуць са школы, кідаюць *тэчкі* і бягуць да архімандрыта дапамагаць!

Цягам двух тыдняў у айца Гаўрыіла з'явілася дапамагаць больш за трыста добраахвотнікаў, якіх ён сам ласкава называе анёламі. Сярод іх трапляюцца і чыноўнікі.

У 8.30 у Кудак з'явіліся гмінныя ўлады. Вітаць мітрапаліта будзе сам войт Якуб Садоўскі. У войтавых руках здобны бохан хлеба і чырвоныя ружы.

— Сённяшні дзень сведчыць пра тое, што мы развіваемся не толькі ў гаспадарчым, але і ў духовым плане, — кажа войт.

Пад прыезд мітрапаліта Рада гміны прыняла пастанову, каб імёнамі кіеўска-пячэрскіх святых Афанасія і Фядосія назваць дарогу з Адрынок у Кудак.

— Айцец Гаўрыіл умее здзяйсняць цуды, — Якуб Садоўскі пад уражаннем спантаннасці, якую праяўляюць людзі. З кожнага боку архімандрыту нясуць дапамогу. Гміна таксама дапамагла падладзіць дарогу, па якой можна дабрацца на машыне на сам астравок.

Ці блізкая перспектыва пабудовы царквы?

Аказваецца, царква ўжо ёсць. Яе за 560 тысяч злотых закупіў у Беларусі прыватны спонсар з Варшавы. Цягам бліжэйшых месяцаў яе перавязуць і збяруць на астраўку. Побач яе стануць два мініяцюрныя домікі-скіты памерамі 5 х 6 метраў.

Манастыр у Адрынках, як усё жывое, нараджаецца ў атмасферы болю і спадзявання. Я пад уражаннем рэлігійнага патэнцыялу нашых жанчын. Для многіх парафіянак, такіх як я сама, няма лепшага месца ў жыцці як урочышча Кудак. Туды хочацца павесці блізкіх, маму, дзяцей.

— І я не бачу лепшага падарунка для сваёй мамы, — кажа беларуская дзяячка Анна з Гданьска.

Вярнулася яна ў роднае Махнатае, каб апекавацца хворай мамай. Марыя Красько пасля чатырох інсультаў. Выбар Анны ўспрымаю як жывую карціну міласэрнасці. Такія сутсрэчы ў месцы старога-новага манастыра прамаўляюць сілай сімвалаў.

— Такія месцы абірае сам Бог, — скажа мітрапаліт Сава, — гэта Гасподзь вызначае нам святыя месцы і прызывае да іх сваіх любімых слуг.

Урочышча Кудак было абранае ўжо ў 1518 годзе, калі па тракце з Кракава ў Вільню падарожнічаў сам кароль. У сне кароль пабачыў тут ікону Антонія Пячэрскага, ад якой ішло святло, — кажа прафесар Антон Мірановіч, які вярнуў гістарычную памяць месцу.

— Пайду прасіць мітрапаліта паблаславіць маю кніжку „Monaster Wniebowstąpienia Pańskiego w Puszczy Błudowskiej". Да гэтай пары, калі вакол асобы архімандрыта Гаўрыіла панавала маўчанне, кніга ўспрымалася неадназначна, — кажа прафесар.

Трыумф ☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

Пачнём са старога савецкага анекдота:

Паклікаў Бог кіраўнікоў розных краін і абвясціў ім, што праз дзень будзе канец свету.

Прылятае кіраўнік ЗША да сябе на радзіму ды выступае перад амерыканскім народам.

— У мяне ёсць для вас дзве навіны, — інфармуе ён амерыканскую нацыю. — Адна добрая, а другая кепская. Пачну з добрай: дакладна стала вядома, што Бог ёсць. А кепская — заўтра канец свету.

Кіраўнік СССР таксама выступае перад сваімі:

— У мяне для вас дзве навіны, — кажа. — І абедзве вельмі кепскія. Першая — Бог усё ж такі ёсць. А другая — заўтра канец свету...

Куды адкіды? ☞ 4

Аляксей МАРОЗ

У бок экалогіі ☞ 5

Міхал МІНЦЭВІЧ

Беласток-Гродна ☞ 8

Міра ЛУКША

Вілінава ☞ 11

Уладзімір СІДАРУК

9 770546 196000

Трыумф

Пачнём са старога савецкага анекдота:

Паклікаў Бог кіраўнікоў розных краін і абвясціў ім, што праз дзень будзе канец свету.

Прылятае кіраўнік ЗША да сябе на радзіму ды выступае перад амерыканскім народам.

— У мяне ёсць для вас дзве навіны, — інфармуе ён амерыканскую нацыю. — Адна добрая, а другая кепская. Пачну з добрай: дакладна стала вядома, што Бог ёсць. А кепская — заўтра канец свету.

Кіраўнік СССР таксама выступае перад сваімі:

— У мяне для вас дзве навіны, — кажа. — І абедзве вельмі кепскія. Першая — Бог усё ж такі ёсць. А другая — заўтра канец свету.

Анекдот просценькі і ўвесь смех яго быў толькі ў тым, што амерыканскі кіраўнік сказаў, што адна навіна добрая, а другая благая, а савецкі — што абедзве навіны кепскія. Зараз беларусы зноў сталі расказваць гэты анекдот, толькі з адной дабаўкай. Сэнс яе ў тым, што аказваецца і беларускі кіраўнік там быў. І вярнуўшыся назад таксама выступіў перад беларусамі:

— У мяне дзве навіны, — заявіў ён. — І абедзве надзвычай добрыя. Навіна першая — Бог мяне прызнаў. І другая — кіраваць я вамі буду да канца свету.

І сапраўды, дабаўка да анекдота вельмі слушная. І нават не тым, што наш кіраўнік стаў ганарыцца, што яго прызналі. Мы гэтае прызнанне не так даўно назіралі на свае вочы. Вялікія гэтага свету, незалежна ад палітычнага ладу краіны і яе эканамічнага становішча, знайшлі час, каб сустрэцца з кіраўніком Беларусі. Як па мне, то ўвесь смак анекдота крыецца ў фразе пра кіраванне да канца свету.

Здаецца, ўвесь зямны шар зараз толькі пра тое і марыць, каб на Беларусі кіраўнік не памяняўся ніколі і кіраваў да канца свету. З рускімі ўсё ясна. Іх беларуская палітычная сістэма задавальняла заўсёды. Яны ўжо трох кіраўнікоў у сябе памянялі. І ўсе яны, і Ельцын, і Пуцін, і Мядзведзеў, хоць з вялікай неахвотай, але саступалі першае дзяржаўнае месца адзін другому. А вось да Беларусі падыход быў супрацьлеглы — касцямі кляліся, абы тут прэзідэнта не мянялі. І падчас спробы імпічменту прыляталі ратаваць сітуацыю, і інвестыцыі ў выглядзе таннага газу і нафты ўлівалі незлічона, і на міжнародным палітычным полі падтрымлівалі. А ўжо крэдытаў тых ільготных, дык надавалі столькі, што хіба самі палічыць не могуць.

Пасля прыйшла чарга і заходніх еўрапейцаў паспаборнічаць з рускімі ў падтрымцы беларускага кіраўніцтва. Духоўных асоб чапаць не будзем. А вось у Сільвіо Берлусконі варта было б спытаць, з якой нагоды ён такі ўлюблёны ў беларускага начальніка, як адэсіт Папандопала быў улюблёны ў пана атамана Грыцыяна Таўрычаскага. Ды што там Італія. Цэлы Еўрасаюз вырашыў пераняць расійскі вопыт і пагуляць у выдзяленне крэдытаў, толькі яшчэ на лепшых умовах чым рускія.

Пра кіраўнікоў лацінаамерыканскіх краін ужо і размовы няма. Уга Чавес апошні кавалак ад сябе аддзярэ, але з беларусамі падзеліцца. А кіраўнікі такіх расійскіх наватвораў як Абхазія і Паўночная Асеція ўвогуле беларускае кіраўніцтва лічаць ледзьве не самым галоўным на ўсім свеце і значна важнейшым чым кіраўніцтва самой Расійскай Федэрацыі, бо прызнання іх Расіяй ім мала. Ім трэба менавіта прызнанне Беларусі. Яны хіба што лічаць, што тады ўвесь свет перад імі капітулюе, як гэта робіць перад беларускім кіраўніцтвам.

Нават Літва, якая да гэтага часу даволі востра выказвалася наконт сённяшняга беларускага рэжыму, вырашыла запрасіць беларускага кіраўніка да сябе ў госці. Праўда, так і не прызналася навошта, але галоўнае хто запрашаў. Пасаромеліся прызнацца, як той кніжны герой з „Дванаццаці крэслаў" Альхен, які так страшна саромеўся сваіх учынкаў, што ўвесь час чырванеў. Але ўсё адно рабіў сваё.

І на фоне гэтага трыумфу існага беларускага рэжыму начальнік беларускай дзяржавы расказаў усім, што правільна робіцца ў Еўропе, а што не. Нават амерыканскага калегу пахваліў, што той адмовіўся ставіць сваю сістэму супрацьракетнай абароны побач з месцам правядзення расійска-беларускіх ваенных вучэнняў.

Адна толькі беларуская апазіцыя пастаралася пераканаць еўрапейскіх дэмакратычных аднадумцаў, каб схамянуліся. Ды што яна можа зрабіць супраць усяго свету.

Віктар САЗОНАЎ

Адкіды

Навошта выкідаць смецце на звалку ці ў кантэйнер, калі можна гэта зрабіць у прыдарожны роў ці лес? Навошта выкідаць недакурак у попельніцу, а пластмасавую ці шкляную бутэльку ў сартавальны кантэйнер, калі можна пад ногі на вуліцу або за акно самахода? Так выглядае рэчаіснасць нашых равоў і лясоў, дзе смецця часам больш чым лістоўя. Цяпер мы ў Еўрасаюзе і па вёсках паяўляецца штораз больш размеркавальных кантэйнераў і ўласных упаковак для смецця. Але навошта клопат пра ўласнае ёмішча, за апаражнянне якога трэба плаціць, калі можна сваё смецце падкінуць у чужы кантэйнер, ці папросту цішком вынесці на бездаглядны суседні пляц? Навошта вяскоўцу з непатрэбнага сена рабіць кампост, калі можна яго выкінуць у кантэйнер каля могілак? І гэтак далей; так дзеецца, напрыклад, у Орлі.

Паводле статыстык кожны жыхар Польшчы на працягу года вырабляе больш трохсот кілаграмаў адкідаў. І хаця з гэтым далёка нам да еўрапейскіх перадавікоў, аднак наша краіна лічыцца адной з бруднейшых у Еўропе. Аптымістычна тое, што паяўляюцца — нават на вёсках — сартавальныя кантэйнеры для смецця і што людзі прысвячаюць ім больш увагі.

Адной з прымет цывілізаванага грамадства, побач узроўню жыцця і наяўнасці культурных каштоўнасцей, з'яўляецца пашана для прыроды. З далучэннем нашай краіны да Еўрасаюза ў Арлянскай гміне назіраецца рост пашаны для прыроды, хаця да ідэалу мы яшчэ ў палове дарогі. Чысцей, а нават раскошна, стала на панадворках, затое ў прыродным асяроддзі пагоршылася. Адной з прычын гэтаму было закрыццё некалькі гадоў таму гміннай звалкі каля Орлі на грунтах вёскі Спічкі. Устарэлая звалка, без нізавой ізаляцыі, перапоўнілася і трэба было яе закрыць. Для паасобных мясцовасцей гміна прыдбала кантэйнеры на другасную сыравіну — шкло, паперу і пластмасу. Людзі ўзрадаваліся гэтай навінкай, аднак ёсць у нас і такія, якія па прывычцы накопліваюць смецце на сваіх панадворках, а пасля цішком вывальваюць яго пад нейкі куст. Многія шафёры або іх пасажыры пазбываюцца бутэлек і банак — а нават напоўненых смеццем мяшкоў — выкідаючы іх праз акно ў прыдарожны роў. Калі растаў снег, тады адкрыліся такія месцы — напрыклад, між Орляй і Вулькай, — дзе на адрэзку некалькіх кіламетраў назбіраўся б цэлы воз. Цікава, ці на згаданым адрэзку павятовай дарогі адпаведныя службы гэта пазбіраюць, ці ўсе адкіды прыкрые трава. Ці навучацца тыя ж шафёры шанаваць прыроду? І яшчэ адну з'яву можна прыкмеціць побач згаданай (думаю, што і пры іншых) дарозе — пры паасобных палетках на абочыне дарогі ляжаць парадкам пакінутыя земляробамі фольгавыя мяшкі і пластмасавыя каністры з-пад апырскавых прэпаратаў.

Паводле гміннай справаздачы па рэалізацыі плана гаспадарання адкідамі за 2008 год, зборка адкідаў вядзецца на тэрыторыі цэлай гміны. Былі закуплены вулічныя кашы, ва ўсіх салэцтвах пастаўлены дармовыя кантэйнеры і ёмішчы для цвёрдых мешаных і селектыўных адкідаў. Заведзены ўлік дамоў на забіранне камунальных адкідаў ад уладальнікаў нерухомасцей. Зараз у Арлянскай гміне ёсць 586 сядзіб з кантэйнерамі (43,38%) і 765 сядзіб, у якіх кантэйнераў на смецце няма; лік такіх кантэйнераў расце.

Варта заўважыць, што адзінай вёскай, у якой ніводзін гаспадар не заключыў дамовы на забіранне адкідаў, з'яўляецца Паўлінова. Мяркую, што ёсць гэтаму вытлумачэнне: побач гэтай вёскі шмат невялікіх дзікіх звалак; нейкі час таму гміна паставіла там вялікі кантэйнер. У іншых вёсках справы маюцца лепш.

У 2007 годзе Арлянская гміна далучылася да Звязу гмін Белавежскай пушчы, якога статутнай мэтай з'яўляецца пабудова прадпрыемства гаспадаркі адкідамі. Жыццё падказвае таксама, што ніхто не хоча такога прадпрыемства па-суседску.

Міхал МІНЦЭВІЧ

Вачыма еўрапейца

Як нас бачаць...

Далікатна гаварыўшы, мяне ахапляла здзіўленне, калі я слухаў у час апошняга пасяджэння сеймавай камісіі нацыянальных і этнічных меншасцей аб экспертызе на тэму „Імідж нацыянальных і этнічных меншасцей у даследаваннях грамадскай думкі". Падрыхтаваў яе Цэнтр даследавання грамадскай думкі (ЦДГД) на падставе даследаванняў за апошнія пятнаццаць гадоў, а асабліва ў гэтым стагоддзі. Прадстаўляючы экспертызу доктар Міхал Вэнцэль адзначаў:

— Большасць палякаў не ведае польскіх грамадзян нацыянальнасці іншай чым польская і не ўмее акрэсліць іх ліку. У адносінах да меншасцей палякі дэкларуюць найчасцей абыякавасць, аднак на працягу апошніх пятнаццаці гадоў значна паменшаў лік тых, хто ставіцца да іх неахвотна.

Аказваецца, найменш сімпатыі выклікаюць ромы і яўрэі. Тут аналітык Цэнтра заявіў:

— Праўдападобна прычынай радзей дэкларыванай сімпатыі да гэтых груп з'яўляецца большая чым у іншых выпадках культурная адменнасць ды пастаянна функцыянуючыя адмоўныя стэрэатыпы, а не ўласны досвед.

Сярод дзевяці нацыянальнасцей пералічаных сярод „сімпатычных" беларусы апынуліся больш-менш пасярэдзіне; лічыўшы ад пачатку пасля славакаў, чэхаў і літоўцаў. Зараз за намі — украінцы, расіяне і немцы. На думку даследчыкаў з ЦДГД, дэкларацыя неахвоты да народа чым меншасці аднак у два разы большая. Гэта здзіўляе, таму што зусім нязгодным з рэчаіснасцю (нават тою — не зусім поўнасцю рэальнай — зарысаванай у выніках апошняга нацыянальнага перапісу) ёсць тое, што апытваныя мяркуюць, што найбольш жыхароў Польшчы „родам з іншай нацыянальнасці" гэта зараз насля немцаў, чаргова: яўрэі і ромы. Зараз пасля іх пералічваюцца ўкраінцы, і толькі тады беларусы (доследы ЦДГД з 1994 і 1999 гадоў). Прытым у адказах на падобнае пытанне пастаўленае два гады таму палякі пералічваюць нацыянальныя ці этнічныя меншасці ў Польшчы вось у такой чарговасці: немцы, украінцы, ромы, яўрэі, расіяне. Толькі тады ўжо беларусы і ўкраінцы. Прытым у 2005 г. 70% дэкларавала, што не ведае асобы з нацыянальнай меншасці, а ў бягучым — 59%.

Найбольш задзівіў мяне аднак адказ на пытанне, што могуць прадстаўнікі (вынікі апошніх даследаванняў з 2005 года). І тут: атрымліваць фінансавую дапамогу ад дзяржавы на падтрымку ўласнай культуры і традыцыі большасць (43%) адказвае, што не павінны. На думку больш чым паловы (52%) не павінны яны мець магчымасці паразумення на роднай мове ў мясцовых установах у мясцовасцях, дзе пражываюць. У сваю чаргу аж 63% не бачыць магчымасці змяшчання табліц з назвамі мясцовасцей на іхняй уласнай мове побач з польскімі назвамі, там дзе жывуць. „Наколькі дазвол на існаванне культурных адменнасцей у прыватнай сферы не выклікае асаблівых сумненняў, настолькі перанос іх таксама ў публічную сферу сустракаецца з супрацівам большасці апытваных", — можна прачытаць у экспертызе.

Успамінаючы аб беларусах у Польшчы доктар Венцэль заявіў між іншым:

— Свядомасць існавання беларускай меншасці на тэрыторыі паўночна-ўсходняй Польшчы нераспаўсюджана. Інфармацыі аб іх прысутнасці ў СМІ не ёсць шырокадаступныя. Даступныя яны сярод культурных эліт.

Прапаную гэтую заўвагу і ўвогуле гэтую экспертызу асабліва шэфам электронных публічных медыяў (глядзіце ў папярэднім нумары „Нівы").

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Абпаленае Краснае Сяло

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

„Варылі нешта ў сагане, на такой печцы, на панадворку. Гаспадар, здаецца, паехаў у Кляшчэлі, ці проста дзесьці пайшоў з хаты. Моцна дуў вецер і панёс іскры з печкі. Заняліся клуня і хлеў. Бледны страх ахапіў тады вёску. Прыехалі пажарнікі, але не вельмі ахвотна збіраліся тушыць агонь. Па клунях стаялі яшчэ памяткі з II сусветнай вайны, маўзеры, кулямёты, гармата ды іншыя „цацкі". Ад агню пачалі будынкі страляць, выбухі, іскры, страх было наблізіцца. Людзі глядзелі як знікае іх дабро, іх хаты, клуні. Кулямёт адзін з гаспадароў са страху выкінуў у калодзеж, магчыма, што яшчэ дзесьці там ляжыць, бо хто б яго выцягваў" (успаміны Сцяпана Карбоўскага з Чахоў-Забалотных).

Нібыта касой агонь зжаў у 1965 годзе палову вёскі Краснае Сяло, цэлы адзін бок. Згарэла амаль восемдзесят хат. Страшнае было гэтае жніво.

***

— Усе казалі: „Што ты робіш, заставайся ў арміі!". У асноўным падбадзёрвалі бацькі, але я вярнуўся на гаспадарку. Не вельмі былі радыя, але я сапраўды хацеў займацца земляробствам. Пакуль што бярэм крэдыты, бо мне ўвесь час залежыць, каб пабольшваць гаспадарку. Пакуль у мяне толькі дзесяць гектараў, але будзе лепш.

Спадару, а нават лепш сказаць гаспадару Патрыку Петрушчыку 24 гады. Яго бацькі жывуць у Бельску-Падляшскім, а ён распараджаецца бацькоўскай зямлёй, а панадворак парадкуе супольна з бабуляй. Усёй сям'ёй займаюцца вырошчваннем агародніны ў даволі вялікім маштабе: памідоры, перац ды іншыя каляровыя смакавітасці. Памідоры Патрык пераважна возіць на біржу, іншыя плады бацькі прадаюць на бельскім рынку. Каб даволі стабільна перажываць зіму, Патрык вырошчвае збожжа. Засейвае свае гектары, збірае і хавае ў склад на панадворку. Сёлета чакае яго непрадказальная зіма. Патрык ведае як цяжка забяспечыцца, але ведае таксама як лёгка і хутка гарыць збожжа. У адным з сёлетніх пажараў у Красным Сяле згарэў яго склад.

***

— У гэты раз яму шанцавала, — з горкай іроніяй каментуе спадар Чарэк Лабасюк. — За адным махам дзве клуні згарэлі!

2009 год. Вёска Краснае Сяло. Тры гады яе жыхароў тэрарызуе злая сіла, твар якой пакуль невядомы. Заглядаю да спадарства Лабасюкоў. Маладая сям'я з вялікай гаспадаркай, дзесяткі гектараў зямлі, дзесяткі кароў. Сядзім у пакоі для гасцей, дзеці ў школе, у фоне чуюцца галасы кароў.

— Пачалося ў верасні, трынаццатага чысла, 2006, года — запальвае папяросу спадар Чарэк, якому трасуцца рукі. — Ад нас пачалося, клуня згарэла, а ў гэтым годзе двойчы гарэлі цюкі сена і саломы. Ён пад хату нават падклаў агонь, пад сходамі, але хутка прыўважылі і не было большай трагедыі.

— Паліцыя пацвердзіла, што кожны раз быў падпал, само не дзеецца, — дадае Марта Лабасюк, — але за руку нікога не злавілі. Пакуль не зловяць па гарачых слядах, нельга абвінавачваць каго-небудзь. Калі ў Патрыка гарэла пару тыдняў таму, нібыта меў алібі, але на гэты раз ужо не... Нібыта бульбу збіраў, але....

Юрчукі на фоне новай клуні

— Цяжка будзе злавіць кагосьці, бо паліцыя прыязджае апошняй, калі людзі затопчуць сляды, калі пажарнікі ўсё патушаць.

***

— Што за ліс такі.... Вычварэнец! Бэстыя, — шукае слоў солтыс Краснага Сяла Аляксандр Кандрацюк. — Якое зараз у нас жыццё, усе баяцца, людзям страх выязджаць з вёскі, ночу пару разоў абыходзяць хаты.

Сорак гадоў пасля вялікага „палымянага жніва", калі ў дым пераўтварылася палова вёскі, у Красным Сяле пасяліўся страх. Роспач, жаль і недавер пранікаюць у жыццё вяскоўцаў. Напружанасць некаторых прыводзіць да крайніх эмоцыяй.

— Я быў такі злосны, што зразу пайшоў яго біць. Цешуся, што не было яго ў хаце, бо не ведаю, як завяршылася б гэтая гісторыя, напэўна для ўсіх бакоў бядой.

З Патрыкам аглядаем згарэлае сховішча. Расказвае пра нядаўнія здарэнні ўжо з перакананнем, што трэба жыць далей, што будзе добра, але з недаверам ды спеласцю прыгадвае свае эмоцыі.

— Я быў проста раз'юшаны, — паўтарае.

Патрык і тое што засталося ад ягонага складу

— Прыехаў Патрык сюды з гэтым „бэйсболам", забіў бы, каб наш Пётрэк падлез яму пад рукі, а так пхнуў толькі майго мужа, гэта прымусіла яго пайсці на аздараўляльны водпуск, — разжалена распавядае спадарыня Зузанна Падгурская — маці падазронага паліцыяй у пажарах хлопца.

Жанчына спыніла мяне пры плоце. Неахвотна размаўляла.

— Чаго вы тут шукаеце? — гыркнула на мяне дачка спадарыні Зузанны. — Тут толькі крыўда!

Гледзячы ў зямлю, маці ўвесь час паўтарала:

— Бог рассудзіць, пабачыце. Мы маляшчыя людзі, верым у Бога, ён пакарае ўсіх вінаватых.

***

— Хто вінаваты? Вядома хто! Праўда, за руку не злавілі, але ён сам прызнаўся, — расказвае пра свайго суседа спадар Юрчук. — Прызнаўся, але ўжо адрокся. Выпусцілі і зноў гарыць. Можа падпальвае нейкім „пілётам" — пультам дыстанцыйнага кіравання, таму яго за руку немагчыма злавіць. Два гады запар нам гарэла клуня. 26 жніўня 2007 года, два дні да „Спленія", цэлы дабытак майго жыцця ў дзве гадзіны знікнуў. Адбудавалі пад іголку, як кажуць. Дзесяць месяцаў прайшло і 30 чэрвеня зноў загарэлася. Загарэлася? Падпаліў! Так у нас жывецца. Бачыце, якія ў мяне апухлыя ногі? Не ад адпачынку.

— Я — хворы чалавек. Мне нельга нервавацца. У мяне такі нізкі ціск, што ад нерваў сэрца можа спыніцца, — са слязамі працягвае спадарыня Зузанна. — Мне нельга нервавацца, але не спім па начах. Раз не дапільнавалі і агароджу нам паламалі.

— Тут п'яны нейкі ехаў. Там, на канцы, таксама камусьці ўехаў у вароты, — умешваецца адна з суседак. — Гэта не па злосці.

— Але спаць і так немагчыма, трэба пільнаваць усю ноч.

— Учора здавалася мне, што чую пах бензіну, — смяецца Чарэк Лабасюк. — Яна не чула, але пасля пачула, а я ўжо не. Такія ночы ў нас. Часам дастаткова, што сабака забрэша, а ўжо бяжым на панадворак.

— Зразумейце, наш Пётрэк не мог бы гэтага зрабіць, гэта добры хлопец! — не вытрымлівае пані Зузанна. — Ён хацеў мець нават свой трактар, дык мы яму дапамаглі, дапамагаем як можам, бо ён вельмі працавіты. Што мы тры трактары маем? За гэта быць зайздросным? За гэта паліць? Абвінавачваюць майго сына, а ў нас колькі разоў гарэла?

***

— У нас гарэла двойчы, але ў Падгурскіх пяць разоў. Калі ўпершыню загарэлася нам клуня, мы заказалі абедню. Не забуду як бацюшка над Евангеллем сказаў: „Хто што робіт, няхай на яго адвернецца". І адвярнулася, гарэла то праз тыдзень, то праз дзень. Сам сваю гаспадарку падпальваў. Ці гэта нармальнае?

Спадарства Юрчукі распавядаюць у дэталях тое, што адбывалася на працягу апошняга года. Калі заўважалі агонь, калі гарэла ў іх, калі ў суседзяў. Распавядаюць таксама гісторыю сваіх прыкрых кантактаў з Падгурскімі.

— Усё было добра, пакуль тая сатана сюды не перавялася. Крычалі, што гэта я ім падпальваў. Крычалі, што напэўна кацап падпальвае, бо пасля нас толькі ў каталікоў гарэла. Мурам за ім стаялі, але ў гэтым годзе, калі мяне зноў спасціг пажар, а і іншыя пацярпелі, ужо не абвінавачваюць так лёгка, — бяссільна тлумачыць спадар Юрчук.

***

— Людзі! Мы ж столькі гадоў жывём разам, каталікі з праваслаўнымі, — адсоўвае ад сябе патэнцыяльны матыў падпалаў солтыс. — Можа калісь хто там што рабіў на чужое свята, але зараз не працуем, калі нашы суседзі святкуюць. Шануем сябе ўзаемна.

— Гэта не на фоне веравызнання, немагчыма, — думаюць уголас Лабасюкі. — Гэта калісь сабе на злосць рабілі, а сёння ў нас няма такіх праблемаў. Няма, на жаль, і салідарнасці, а тут дзейнічае нейкі псіхапат. Амаль усе пажары здараліся ў панядзелак, кожны раз між 11-й і 13-й гадзінай, апоўдні, калі ўсе пры рабоце, або ў полі, або недзе па-за вёскай па справах. Хто ёсць паблізу, то збярэцца, але агонь знікне і людзі разыходзяцца, прыбірай сабе сам. Каб хто падзяліўся кормам, сарганізаваў нейкі збор... не ў нас.

— Ажно баюся думаць, што ён адчувае, калі надыходзіць панядзелак, — з задумення вяртаецца солтыс. — Свярбяць яму рукі? Можа гэта дае яму прыемнасць? Але ж прыемнасць прыносіць толькі нясенне дабра!.

***

— Мы найгоршыя, а яны без віны... — Зузанна Падгурская апускае рукі. — Пасадзілі нашага хлопца за краты. Не дапускалі нас, не інфармавалі.

— Каб не дапамога дзядзькі, нічога не ведалі б, — падымае голас сястра Пётрка. — Толькі крыўда нас сустракае, ніхто яе не зразумее. Марнуюць нам жыццё.

Спадарства Юрчукі паказваюць чарговую новую клуню, без дзвярэй, бо не хапіла грошай, але да зімы штосьці прыдумаюць.

Марта Лабасюк:

— Плачу толькі пару гадзін пасля пажару. Пазней трэба ўжо жыць.

Сваю сітуацыю падводзіць таксама Патрык:

— Вазьму чарговы крэдыт. Ужо бабуля дапамагла, бацькі таксама дапамагаюць як могуць. Спраўлюся. Хачу.

Стыпендыі за беларускую мову

15 верасня 2009 г. прызнаныя грашовыя стыпендыі вучням з Падляшша за выдатныя дасягненні ў вучобе. 55 грашовых стыпендыяў за выдатныя дасягненні і вынікі ў вучобе прызнала ўправа Падляшскага ваяводства. Сярод стыпендыятаў лаўрэаты міжнародных, агульнапольскіх ды ваяводскіх прадметных алімпіядаў. Сярод іх, між іншым, **Аляксандра Каліна**, **Наталля Кандрацюк-Свярубская** і **Магдалена Саковіч** — вучаніцы 3-га і 4-га Агульнаадукацыйных ліцэяў у Беластоку, лаўрэаткі агульнапольскай алімпіяды па беларускай мове, **Іаанна Герасімюк**, вучаніца Агульнаадукацыйнага ліцэя з беларускай мовай навучання ў Гайнаўцы, і **Аляксандра Кірылюк**, вучаніца школы Пачатковай № 6 у Гайнаўцы, лаўрэатка агульнапольскага конкурсу па беларускай мове. З агульнаадукацыйнага ліцея з беларускай мовай навучання імя Браніслава Тарашкевіча ў Бельску-Падляшскім стыпендыі атрымалі аж тры вучаніцы: **Юльяна Дораш, Аксана Федарук і Эдыта Маркевіч,** — кажа дырэктар ліцэя **Андрэй Сцепанюк**. - *Гэта сапраўднае дасягненне. Мы выступаем за стыпендыі тым вучням, якія штосьці дасягнулі. У мяне кожны год хтосьці даставаў такія стыпендыі.* Як паведаміў **Андрэй Сцепанюк**, выдатныя вучні з Бельскага ліцэя з беларускай мовай навучання атрымліваюць таксама грашовыя стыпендыі прэм'ер-міністра, а таксама міністра нацыянальнай адукацыі.

Анна Шайкоўская,
www.racyja.com

Бяспечная дарога ў школу

Гайнаўскія паліцыянты вядуць прафілактычную дзейнасць у рамках акцыі „Бяспечная дарога ў школу". Сустрэчы арганізуюцца ў коле наймалодшых дзетак.

Такая сустрэча праходзіла 10 верасня ў Белавежы. Мэтай сустрэчы з'яўлялася памяншэнне і абмежаванне небяспечных здарэнняў з удзелам

фота КПП

дзяцей. Паліцыянты мясцовага пастарунка супольна з функцыянерамі Пагранічнай стражы тлумачылі дзецям, як павінны паводзіць сябе на дарогах і вуліцах, ідучы ў школу. Асаблівую ўвагу звярталі на небяспеку, калі сутыкнуцца з чужымі сабакамі ды невядомымі ім асобамі. Малечы атрымалі ад функцыянераў практычныя парады, як сябе паводзіць у такіх выпадках. Апрача таго арганізатары ў час сустрэчы напаміналі дзеткам, як павінны паводзіць сябе, калі застаюцца адны ў хаце, а таксама ў школе ці ў час падарожжа ў школу. Пазнаёмілі з працай паліцыянтаў і пагранічнікаў, з прыладамі іх штодзённай працы. Удзельнікі белавежскай сустрэчы атрымалі філкеры — водбліскавыя дэталі на ранцы і адзенне, каб быць больш бачнымі на дарозе. **(ус)**

Куды складваць адкіды?

Старыя звалкі адкідаў, распаложаныя побач вуліцы Парыева ў Гайнаўцы, перапоўненыя і трэба як найхутчэй распачаць сартаванне смецця сабранага на іх у Прадпрыемстве гаспадаркі адкідамі. Непрыдатныя да паўторнага выкарыстання адкіды трэба будзе кудысьці вывозіць

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Яшчэ ў жніўні людзі з часткі квартала Юдзянка, часткі вуліцы Вжасовай з Гайнаўкі ды жыхары вёсак Прагалі і Хітрая (Гайнаўская гміна) рашыліся выступіць да бурмістра і гарадскіх радных з просьбай змены планаў размяшчэння звалкі адкідаў няздатных да паўторнага выкарыстання ў прадукцыі. Іх, згодна з планам гаспадарання ў Гайнаўцы, прадбачваецца складваць на акраіне гарадскіх тэрыторыяў у напрамку сяла Хітрая (Прагалі знаходзяцца збоку, па дарозе ў Хітрую). На сустрэчы наладжанай у гарадскім магістраце з бурмістрам Анатолем Ахрыцюком сабраныя заклікалі да адмянення гарадскіх планаў наконт размяшчэння новай звалкі.

Прадстаўнікі гарадскіх улад інфармуюць, што тэрыторыі вызначаныя пад звалку знаходзяцца ў адлегласці мінімум 1600 метраў ад сядзіб, што ёсць у 10 разоў больш ад еўрасаюзных патрабаванняў.

— Гэта не будзе звычайная звалка, на якую будуць вывозіць адкіды на машынах і з іх туды папросту высыпаць, — інфармуе бурмістр Анатоль Ахрыцюк. Працаўнікі гарадскога магістрата заяўляюць, што на звалку мелі б вывозіцца спрасаваныя формы, якія будуць укладвацца на забяспечанай знізу пляцоўцы, каб нават у будучыні не выцеклі з іх у глебу ніякія вадкасці. Прадстаўнікі гарадскіх улад кажуць пры гэтым, што адкіды будуць малавымывальнымі. Аднак пратэстуючыя людзі звяртаюць таксама ўвагу на запаведнік „Горнянскія лугі", які будзе знаходзіцца недалёка дарогі на звалку і непадалёк ад самой звалкі.

— Гэта будзе канец запаведніку! Гайнаўка мела быць турыстычным горадам, а мы пазбываемся аднаго з атракцыёнаў! Запаведнік перастане існаваць, бо тут будуць ездзіць грузавыя машыны, будзе смуродна і брудна, — кажа адна з жыхарак Прагалёў.

Праблемы са складваннем смецця, прамысловых і бытавых адкідаў былі, ёсць і пэўна доўга яшчэ будуць. Еўрасаюзныя дырэктывы прымушаюць дастасаваць польскае заканадаўства да еўрасаюзных патрабаванняў, што практычна закрывае магчымасць складвання адкідаў у невялікіх гмінах на сваёй тэрыторыі. Спачатку мусіць быць праведзенае сартаванне ўсялякіх адкідаў і смецця, а выдзеленыя шкло, пластмасу, паперу, розныя металы, тканіны і іншую сыравіну здатную да паўторнага выкарыстання можна і трэба здаваць у прадукцыю. Гэта прадбачваецца рабіць у Прадпрыемстве гаспадаркі адкідамі побач вуліцы Парыева ў Гайнаўцы, а на гэтую інвестыцыю, якая мае распачацца ў бліжэйшым часе, гарадскія ўлады маюць ужо гарантаваныя больш за 8 мільёнаў злотых з еўрасаюзных сродкаў. Каб збудаваць лініі сартавання смецця і іншую інфраструктуру ў ПГА, трэба яшчэ выдаткаваць прынамсі столькі ж сваіх грошай, або дадаткова раздабытых сродкаў. Разам з выдзяленнем згаданых мною вырабаў прадугледжваецца таксама атрымліваць арганічную біямасу, якая будзе вывозіцца на кампастоўнік. Толькі адкіды і смецце няшкодныя непасрэдна для асяроддзя і няздатныя для пераапрацоўкі можна будзе пасля адпаведнай перапрацоўкі і спрасавання ў кубікі складваць на выдзеленых для гэтага пляцоўках такіх, як спрэчная планаваная ў напрамку Хітрай. Гэтыя месцы пасля павінны прыкрывацца зямлёй і будзе сеяцца на іх трава, каб не псаваць краявіду. Такія ёсць задумы, але пратэстуючыя людзі з Гайнаўкі і наваколля не вераць ім да канца.

Жыхары многіх прыгарадскіх і больш аддаленых ад гарадоў мясцовасцей пратэстуюць супраць будавання побач іх утылізацыйных прадпрыемстваў, асабліва „цывілізаваных" звалак адкідаў, пра якія інвестары завяраюць, што яны будуць няшкоднымі для глебы, падземнай вады, акружаючай прыроды, а тым болей для людзей пражываючых недалёка ад іх. Супраць будовы новага прадпрыемства спачатку выступалі таксама жыхары Парыева, але калі атрымалі абяцанне, што ў ім будуць перасартаваныя адкіды з сённяшняй і ранейшых звалак, якія ім надакучылі, згадзіліся на новую інвестыцыю. Пасля пратэстаў жыхароў Дубяжына (Бельская гміна) і суседніх сёл зараз стрымана каля іх рэалізацыя праектаў будовы ўтылізацыйнага прадпрыемства і звалкі непрыдатных для паўторнага выкарыстання адкідаў. Першапачаткова ўлады Гайнаўкі планавалі вывозіць у Бельскую гміну адкіды, што будуць няздатнымі да паўторнага выкарыстання ў прадукцыі. Калі аднак спынілася інвестыцыя побач Дубяжына, гайнаўскія ўлады выбралі на новую звалку месца на „Горнянскіх палях", як іх называюць жыхары навакольных вёсак, што згодна з гарадскімі планамі гаспадарання, падрыхтаванымі яшчэ ў васьмідзесятыя гады.

— Чаму ніхто не гаварыў нам аб планах выкарыстання гэтых тэрыторыяў пад адкіды, калі мы куплялі тут участкі пад будову дамоў? — абураўся жыхар Гайнаўкі, але яму адказалі, што планы гаспадарання ў горадзе яўныя і зацікаўленыя асобы могуць даведацца пра іх.

Нядаўна з боку спрэчных тэрыторыяў асфальтавалі вуліцу Вжасовую (яна ў мінулым была палявой дарогай з калдобінамі), што спалучала вёскі Горнае (цяпер вуліца) і Хітрую, праходзячую побач Прагалёў. Заасфальтаваная дарога даходзіць да Хітрай і ідзе далей у Дубічы-Асочныя і Махнатае. Жыхары вуліцы Горнай і згаданых вёсак рады, што зрабілі адпаведную падсыпку і асфальтавалі дарогу па якой зараз людзі могуць дабірацца ў горад на машынах, а гаспадары зручна ездзіць на свае палі на камбайнах і іншай сельскагаспадарчай тэхніцы. Аднак, калі мясцовыя людзі даведаліся, што па гэтым асфальце могуць ездзіць таксама грузавыя машыны з адкдідамі на месца звалкі, хочуць сабраць подпісы пад пратэстам супраць будовы тае звалкі побач іх палёў і ў далейшым суседстве з дамамі. Жыхары ўскраіны Гайнаўкі заяўляюць, што будуць прасіць дапамогі ў міністра асяроддзя і эколагаў. Аднак штосьці ж трэба будзе зрабіць з адкідамі непрыдатнымі для паўторнага выкарыстання! Як знайсці ў Гайнаўцы новае месца пад будову звалкі, якое не выклікала б незадавальнення людзей якія жывуць блізка яго? Жыхары вуліцы Дольнай і вёскі Выгода таксама не будуць згаджацца на звалку распаложаную недалёка ад іх дамоў, а там няма і адпаведнай дарогі прыстасаванай да руху грузавых машын. Калі б нават такую дарогу збудаваць, трэба было б адкіды вазіць праз цэлы горад і пры гэтым мяняць планы гаспадарання ў горадзе, што няпроста зрабіць пры супраціве людзей. Будуць таксама крытыкаваць ідэю будовы звалкі распаложанай за планаваным на будучыню вадасховішчам, напэўна і жыхары вуліцы Парыева не згодзяцца на чарговую звалку побач іх дамоў. Нельга таксама будаваць звалку на якасных, сельскагаспадарча выкарыстоўваных землях, а і такія цяжка было б знайсці ў Гайнаўцы ў далейшай адлегласці ад сядзіб. Можа сапраўды вывозіць спрасаваныя адкіды за адплатнасцю па-за Гайнаўку? Аднак гэта было б каштоўным і невядома, ці схочуць браць адкіды з гайнаўскага прадпрыемства ў Бельскім павеце ці іншых месцах у Падляшскім ваяводстве. Праблема сур'ёзная і павінна быць вырашана ў набліжэйшы час.

У напрамку экалогіі

Гутарка з Вальдэмарам ВАСІЛЕЎСКІМ, спецыялістам па экалогіі і ахове асяроддзя пры Асяродку сельскагаспадарчай кансультацыі ў Бельску-Падляшскім.

— ***Як выглядае сельскагаспадарчая экалогія ў Арлянскай гміне?***

— У Арлянскай гміне малы лік экалагічных гаспадарак — каля дзесяці. Экалогія, як напрамак дзеяння, прынцыповую ўвагу адводзіць малым і сярэднім гаспадаркам, бо, напрыклад, экалагічная гаспадарка плошчаю за сто гектараў атрымлівае напалову меншыя даплаты з Агенцтва сельскагаспадарчага прагрэсу. Цяжка мне сказаць, чаму на тэрыторыі Арлянскай гміны так мала экалагічных гаспадарак, бо ж велічыня экалагічных даплат удвая большая ад абшаравых даплат. Напрыклад, экалагічная даплата да ворнага грунту, значыць вырошчвання збожжа, складае 600-680 злотаў, але ўжо за экалагічныя трускалкі ці маліны яна сягае 1 800 злотаў, а за гародніну тысячу.

— ***Экалагічная вытворчасць адбываецца без удзелу сродкаў аховы раслін і штучных угнаенняў — але што ў іх шкоднае?***

— Пырсканая і падкормліваная штучнымі ўгнаеннямі бульба, хаця большая, аднак менш смачная, інакш выглядае пасля скрабення, хутка мяняе колер, разлазіцца ў час варкі. Экалагічная, хаця драбнейшая, не мае тых заган. Гэтаксама ёсць і з іншымі прадуктамі і грамадства паволі пачынае гэта ацэньваць належным чынам. У Бельскім павеце экалагічныя ўгоддзі складаюць усяго адзін адсотак, не вырас яшчэ паўнакроўны рынак збыту, аднак завязваюцца яго фрагменты для паасобных відаў здаровых прадуктаў. Калі нехта купляе ў селяніна вепрука, плаціць больш, ведаючы, што той корміць яго без кармавых канцэнтратаў і прымесей. Значыць, ёсць рух у добрым, экалагічным напрамку.

— ***Дык чаму, нягледзячы на атракцыйныя даплаты, сяляне ў Бельскім павеце не развіваюць гэтай экалогіі? У чым тут справа?***

— Сяляне, галоўным чынам, баяцца дакументаў — іх уліку і штогадовага запаўнення. У экалагічныя гаспадаркі раз у год прыязджаюць кантралёры, якія складаюць пратакол, на аснове якога агенцтва выплачвае грошы. І для гэтага пратакола патрэбныя некаторыя дакументы, не надта складаныя. Першапачаткова селянін пераважна звяртаецца да нас, у Асяродак сельскагаспадарчай кансультацыі. Дапамагаем яму пры першай праверцы, а далей ён ужо сам ведае, як весці справы. Варта яшчэ дадаць, што сяляне, якія пачынаюць гаспадарыць паводле экалагічных патрабаванняў, без прымянення хіміі, апасаюцца, што з іх будуць смяяцца: як жа гэта гаспадарыць без штучных угнаенняў! Радуе тое, што калі нехта ў вёсцы «ўвойдзе» ў экалогію, то на наступны год у той жа вёсцы маем двух-трох новых зацікаўленых. Яны ведаюць, што, апрача дадатковых даплат, таму селяніну ўдаецца нешта выпрадукаваць і ўтрымаць гаспадарку. Ураджай, вядома, крыху меншы, але істотнае тое, што атрыманыя прадукты здаровыя.

— ***А як, для прыкладу, выглядае збыт экалагічна выгадаваных парасят?***

— Некаторыя фірмы купляюць любы лік такіх кормнікаў, аднак мусіць быць іх больш, напрыклад, дзесяць штук. Такіх мясарняў няма, на жаль, у нашым ваяводстве, яны ёсць на поўдні краіны. Ведаю, што не хапае ім сыравіны і яны ахвотна прыехалі б да гаспадароў па такі тавар. Экалагічныя свініна ці ялавічына даражэйшыя ад менш якасных, гэтак жа і фабрыкаты з іх. Справа ў лепшым смаку, за які палякі пачынаюць плаціць больш, бо ведаюць, што такія прадукты здаровыя і якасныя. Пакуль, аднак, большасць экалагічных харчоў прадаецца на Захад, дзе ўсе імі захапляюцца. Калі гаварыць пра збожжа, то ў нашым ваяводстве ў Шэпятоўскай гміне працуе млын, які скупляе экалагічнае збожжа. Таксама вырашчаныя ў экалагічных умовах зёлкі, садавіна і гародніна маюць збыт — трэба адно мець адпаведны сертыфікат.

— ***Яблыкі, якія купляем у крамах ці на рынку, прыгожа выглядаюць, бо яны пырсканыя. Але калі зараза пранікне ў сад, то спадзявацца ўраджаю не прыходзіцца...***

— Вядома, што непырсканы яблык будзе з паршой, але астанецца экалагічным. Яблыкі з чыстай скуркай, якія мы купляем, у вегетатыўным сезоне апырскваюцца штотыдзень або і часцей. Затое паршывыя яблыкі паказваюць адсутнасць апырсквання. Калі ў ім знойдзецца чарвяк, гэта абазначае, што ён здаровы. Толькі чалавек з'ядае тое, што таннае, заміж таго, што лепшае.

— ***Што Вы мяркуеце пра будучыню экалагічнага земляробства ў краінах Еўрасаюза?***

— Гэта будучыня, а Польшча пастаянна лічыцца «зялёнымі лёгкімі» Еўрасаюза. Экалагічны напрамак Еўрасаюза гэта не толькі экалагічныя гаспадаркі — ёсць там месца і для хімізаваных гаспадарак, якія маглі б карыстацца дадатковымі перавагамі ад чыстага асяроддзя ў іх акружэнні.

— ***Ці экалогія мае шанс выйграць з хімізацыяй, ці яна астанецца адно элітарнай галіной дзейнасці? Даруем тут заўвагу, што многія сяляне па эканамічных прычынах вымушаны абмяжоўваць прымяненне хімікатаў...***

— Экалогія можа не пераўзыдзе значэння хімізаванай гаспадаркі, але напэўна будзе развівацца. Калі я пачынаў працу ў нашым асяродку, было ў ім зарэгістраваных дзевятнаццаць экалагічных гаспадарак, а зараз іх амаль сто. Найбольш у Бельскай гміне, можа з-за блізкасці да нас. Магу толькі заахвочваць сялян, асабліва тых, у якіх сярэднемаштабныя гаспадаркі, каб не баяліся «ўваходзіць» у экалогію, каб не баяліся справаводчых дакументаў, каб не апасаліся экалагічных праверак, бо гэта нічога страшнага. Дарэчы, сам вяду экалагічную гаспадарку ў Вышкаўскай гміне. Калі я ў 2005 годзе заводзіў яе, мой бацька не надта станоўча ставіўся да маёй задумы, а цяпер у маёй мясцовасці ўжо некалькі такіх гаспадарак.

— ***На канец у мяне такое пытанне: Орля і яе наваколле час ад часу маюць клопат з непрыемным пахам, калі некаторыя сяляне выліваюць на палі згушчаную гнаёўку. Смурод ад гэтага так невыносны, што немагчыма выйсці на двор, асабліва летам, калі парна і зацішна. Гэтая праблема санэпідэмстанцыю не цікавіць, а Аддзел аховы асяроддзя пры Павятовым старостве ў Бельску-Падляшскім тлумачыць, што ў краіне няма пахавых норм. Здараецца таксама, што сяляне пакідаюць у полі вывезены гной на даўжэйшы час.***

— Вывезены ў поле гной павінен быць прыараны на працягу сутак, нягледзячы ці гэта гной, ці гнаёўка. Існуюць еўрасаюзныя нормы і Польшча прыстасоўваецца да іх. Вываз гнаёўкі будзе фармальна кантраляваны, будуць таксама меры за парушэнне норм. З 2009 года пачынае абавязваць прынцып узаемнай згоднасці на аснове звычайнай добрай практыкі. Пачынаем пільнаваць выконвання тых прынцыпаў.

Размаўляў Міхал МІНЦЭВІЧ

Фота Міхала МІНЦЭВІЧА

Медычнае супрацоўніцтва

Першая дзелавая сустрэча па выкарыстанні еўрасаюзных фінансавых сродкаў у галіне медычнага супрацоўніцтва паміж Гарадзенскай вобласцю і Падляшскім ваяводствам прайшла ў Анкалагічным цэнтры ў Беластоку 16 верасня. У сустрэчы прымалі ўдзел медычныя дырэктары беластоцкіх шпіталяў і медычныя прадстаўнікі з Гародні. Мэта сустрэчы — выпрацаваць супольныя праекты транспамежнага супрацоўніцтва ў лекаванні і прафілактыцы анкалагічных захворванняў, а таксама стварэнне сучасных цэнтраў аператыўнага транспамежнага рэагавання ў галіне хуткай дапамогі. Удзельнік сустрэчы галоўны лекар абласнога клінічнага шпіталя ў Гародні **Светаслаў Савіцкі** лічыць найболей паспяховым праектам супрацоўніцтва ў галіне метадаў лекавання ракавых захворванняў: *Найважнейшая праблема для нас — гэта сродкі лячэння анкалагічных хворых з выкарыстаннем адмысловага абсталявання. Гэта гама-нажы, гэта лінейныя паскаральнікі электронаў, якія сёння працуюць тут, на Беласточчыне. Набыўшы гэтае абсталяванне, мы маглі б палепшыць вынікі тэрапіі анкалагічных хворых. Другі накірунак — гэта арганізацыя праграм дыягностыкі анкалагічных захворванняў на ранніх стадыях іх развіцця.* Праект медычнага супрацоўніцтва ажыццяўляецца за кошт сродкаў Еўрасаюза па праграме Усходняга партнёрства.

Валя ЛАЕЎСКАЯ, www.racyja.com

Што ў лесе

Гэтым летам грыбнікам не пашанцавала. У ліпені былі ягады і лісічкі. Думалі, што жнівень падорыць шляхетныя баравікі, але яны забаставалі — не раслі і ўсё! Нават мухамораў не было тады ў лесе. У надлясніцтве Броўск у Нараўчанскай гміне было шмат турыстаў з усяе Польшчы. Для пешых і веласіпедных вандровак надлясніцтва падрыхтавала прыродазнаўчыя сцежкі, на якіх размешчаны ілюстраваныя табліцы. Гэтыя табліцы інфармуюць людзей аб жыцці дрэў і пушчанскіх раслін, аб жыцці звяроў, іх карысці для лесу і чалавека. Уважліва чытаючы, можна пашырыць свае веды. Вось некалькі цікавінак. Падлічана, што адна сойка за месяц можа назбіраць на зіму каля 4 000 жалудоў. Цікава, што адна 60-гадовая сасна вырабляе за суткі 1 350 — 1 800 літраў кісларода, патрэбных для трох чалавек на цэлыя суткі. Воўк за ноч можа прабегчы 60 кіламетраў. Вечарам ён каля Белавежы, а раніцай пад Заблудавам. Людзі ядуць лясныя ягады, але нельга частавацца чырвонымі ягадамі воўчага лыка. 10 — 12 такіх ягадак — смяротная доза для чалавека. Шмат гаворыцца аб ахове Белавежскай пушчы, але не ўсе турысты гэта разумеюць. Гіне частка інфармацыйных табліц. На абочынах дарог з Альхоўкі ў Масева валяюцца банкі з-пад піва, пластмасавыя бутэлькі. Як відаць, свядомасць у аматараў піўца невялікая. Ім, пэўна, здаецца, што і так „nie będzie nas, będzie las". Усё штораз больш людзей разумее, што для актыўнага адпачынку патрэбны чысты натуральны лес.

Мікалай ВАРАНЕЦКІ

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Падарунак у дзень анёлаў

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Архімандрыт Гаўрыіл са сваімі прыслужнікамі і вернікамі

— Мы прыехалі ў Адрынкі, бо ў нас сямейнае святка. У нашага сынка дзень анёла, — кажа Марта Шум з Рахвалаўкі каля Беластока.

Сёння — 15 верасня. У праваслаўным календары імяніны Антона.

— Якое гожае імя! — захоплена цётка Ніна, якая стаіць разам са мной. Ёй падабаецца, што ахрысцілі малога па-колішняму: — Такое справядлівае імя, нявыдуманае, не з тэлебачання.

Антоніку Шуму восем месяцаў. Ён на руках у мамы і таты. Хлопчык, як той анёл, усміхаецца незнаёмым цёткам і дзядзькам. Працягвае ручкі. Ці запамятае сённяшні дзень? У дзень яго анёла ў Адрынкі, што ля мястэчка Нарва, прыбылі людзі з усёй Беласточчыны. Разам з мітрапалітам Савам тут асвяцілі астравок Кудак пад новы манастыр. Кляштар будзе названы ў гонар кіеўска-пячэрскіх святых айцоў Антонія і Феадосія.

— А хто прыдумаў такі падарунак? — пытаем у бацькоў малога.

— Мы разам, — чую ў адказ. Марта і Андрэй Шум палічылі, што такі падарунак найбольш адпаведны дзіцятку ў дзень анёла. Каб іх сынок узрастаў разам з манастыром. Калі падрасце, бацькі раскажуць Антоніку пра гістарычную падзею ў Адрынках.

* * *

Месца, пра якое вам апавядаем, мясцовыя людзі называюць Кудак. Яно дзікае і схаванае ад людскіх вачэй. Востраў ахіляюць буйны трыснёг ды вербалоз. Вясной, калі пачынаюцца паводкі, тут не прайсці, не праехаць. На астраўку, прытуленым да ракі Нарвы, жыве самотна ахімандрыт Гаўрыіл. Яго часта наведваюць казулі, ваўкі. Праз астравок праходзіць вандроўны вужовы шлях. Архімандрыт з любоўю гаворыць пра вужак і ваўкоў. Яны не чапаюць без патрэбы чалавека, бягуць або паўзуць сваімі сцяжынамі-шляхамі. Тут гняздуюць і многія жураўліныя сем'і. Іх крык працінае паветра вясновымі раніцамі і адвячоркамі. За рэчкай пачынаецца пушча. Над вадой можна прайсці новай кладкай, якую паставілі людзі з Рыбакоў. І пайсці па чарніцы, якімі славіцца гэты куточак пушчы.

— А каб вы ведалі, як палюбілі гэтае месца нашы дзеці, — бабуля Вольга Вайкоўская хваліць школьнікаў з Адрынок. Іх шасцёра ў вёсцы. — Прыедуць з Нарвы са школы, кідаюць ранцы і бягом спяшаюць у пустэльню. І просяць каб архімандрыт даў ім якуюсь работу, усе тут дапамагаць яму хочуць.

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Антонік Шум з бацькамі

ЗОРКА

Тэатральныя сёстры

— Мы дваюрадныя сёстры, — Ала Зіневіч туліць да сябе Адрыянку. Сустрэліся на беларускім свяце. Пані Ала — настаўніца-інструктар. Яна жыве ў Орлі. Разам са сваімі акцёрамі-школьнікамі прыехала ў Беласток са спектаклем „Сям'я Міхальскіх".

Адрыяна Бакер — беластачанка. З наймалодшых гадоў выступае на беларускай сцэне.

Яшчэ ў прадшколлі мы пабачылі ў ёй здольную дэкламатарку. Зараз дзяўчынка ходзіць у III „ц" клас беластоцкай чацвёркі. Разам з сябрамі вывучае беларускую мову і ходзіць на тэатральны гурток. Сёння іграла ў спектаклі „Брыдкае качаня" (Маму-курыцу). І адразу, пасля выступлення, яна падбегла да сваёй старэйшай сястры, каб спытаць пра ўражанні ад іх выступлення.

Ала і Адрыяна — зоркі на сцэне.

ЗОРКА

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Гусі

Канстанцін Ушынскі

Васілёк убачыў чараду дзікіх гусей, якія ляцелі высока ў паветры.

В а с і л ё к. Ці могуць так лётаць нашы свойскія гусі?

Б а ц ь к а. Не.

В а с і л ё к. Хто ж корміць дзікіх гусей?

Б а ц ь к а. Яны самі адшукваюць сабе ежу.

В а с і л ё к. А ўзімку?

Б а ц ь к а. Як толькі настае зіма, дзікія гусі адлятаюць ад нас у вырай, а ўвесну вяртаюцца зноў.

В а с і л ё к. Але чаму свойскія гусі не могуць лётаць гэтаксама добра і чаму не адлятаюць яны ад нас на зіму ў вырай?

Б а ц ь к а. Таму што свойскія жывёлы страцілі ўжо часткова ранейшы спрыт і сілу, і чуццё ў іх не такое тонкае, як у дзікіх.

В а с і л ё к. Але чаму гэтак здарылася з імі?

Б а ц ь к а. Таму што людзі пра іх клапоцяцца і адвучылі іх карыстацца ўласнымі сіламі. З гэтага ты бачыш, што і людзі павінны старацца рабіць самі для сябе ўсё, што толькі могуць. Тыя дзеці, якія карыстаюцца чужымі паслугамі і не прывучаюцца самі рабіць для сябе ўсё, што толькі могуць, ніколі не будуць моцнымі, разумнымі і спрытнымі людзьмі.

В а с і л ё к. Не, цяпер я буду старацца сам усё для сябе рабіць, а то, бадай, і са мною можа зрабіцца тое самае, што са свойскімі гусямі, якія развучыліся лётаць.

Чыжы

Чарговая мясцовасць, у якую завялі нас падляшскія шляхі, гэта Чыжы. Мясцовасць, якая сёння з'яўляецца сядзібай гміны, узнікла праўдападобна на пачатку XVI стагоддзя. Першыя згадкі ў пісьмовых дакументах датычаць 1529 года. Варта адзначыць, што ад самага пачатку свайго існавання Чыжы былі каралеўскай вёскай.

Узялося гэта адтуль, што ў вёсцы пражывалі стральцы — катэгорыя служэбнага насельніцтва, абавязкам якога, апрача паляванняў у Белавежскай пушчы, быў удзел у ваенных паходах. Дзякуючы гэтаму стральцы былі звольнены з паншчыны. У час вайны выконвалі яны важную ролю, а менавіта ішлі побач гармат. Вёска Чыжы мела пастаўляць на вайну 20 стральцоў у поўным абмундзіраванні. Кожны стралец атрымліваў дзве валокі зямлі, ад якіх не плаціў падаткаў. Згадкі аб чыжоўскіх стральцах можна знайсці яшчэ ў канцы XVIII стагоддзя.

Варта дадаць, што ў каралеўскіх Чыжах, апрача стральцоў, жылі такса ма асочнікі.

http://www.ugczyze.pl

Ужо ў XVI стагоддзі ў Чыжах існавала Успенская царква. У яе былі свае багатыя фундатары — валадары і мясцовыя стральцы, і таму яна была адной з найпрыгажэйшых і найлепш абсталяваных цэркваў Бельскай зямлі. На жаль, у дзень прыхадскога свята, 28 жніўня 1984 года згарэла яна разам з усім абсталяваннем. Сёння ў гэтым самым месцы ўзвышаецца мураваны храм.

У 1915 годзе жыхары Чыжоў, як амаль усе праваслаўныя жыхары навакольных беларускіх зямель, у сувязі з наступленнем нямецкіх войскаў, пераконваныя і запалохваныя царскімі жаўнерамі, адправіліся ў бежанства — масавыя ўцёкі ў глыб Расейскай імперыі. З Расіі бежанцы вярнуліся ў 1918-1921 гадах.

Шкада — што менавіта падвойнай назвай нас не вітаюць Чыжы

У 1941 г. у в аколіцы Чыжоў, ва ўрочышчы *Сярэбраная гуорка* разыгралася бітва, у якой загінула некалькі соцень савецкіх жаўнераў і кадэтаў. Месца гэтай трагедыі ўвекавечваюць крыжы, каля якіх адбываюцца адпаведныя акалічнасці набажэнствы.

На прыхадскіх могілках, што непадалёку вёскі Лянева, знаходзіцца царква св.св. Кузьмы і Дзям'яна, якую асвяцілі 12 кастрычніка 1889 года. Адно з паданняў гаворыць, што была яна перанесена з вёскі Локніца каля 1812 г.

Існуе таксама погляд, што гэта даўняя прыхадская царква з саміх Чыжоў. Недахоп канкрэтных крыніц не дазваляе аднак праверыць гэтыя супярэчлівыя інфармацыі. Адно пэўнае — могільнікавая царква выконвала калісьці ў іншым месцы ролю прыхадской царквы. На саміх могілках варта таксама прыглядзецца цікавым намагільным камяням і драўляным крыжам. У гэтай аколіцы існуе багатая традыцыя вырабу такіх крыжоў.

Міхась СЦЕПАНЮК

Сяржук СОКАЛАЎ-ВОЮШ

Змей

Змей за хатай знічку з'еў —
Зуб у Змея забалеў.
Змей лячыў яго заўзята:
Зёлкі клаў сабе на пяты,
Лез у гразь, як парасё, —
Але зуб баліць — і ўсё.

Міра ЛУКША

Жоравы з Жураўліка

У мокрым урочышчы Жураўлік
жывуць Грусы: Шарлотачка і Паўлік.
Стройна, дастойна па балоце ходзяць,
двое маленькіх жораўкаў выводзяць.
Вось і яны: у кожнага плюмажык-хвост,
і шэрапёрыя — на поўны рост,
у кармінай шапачцы на галаве,
з белымі шчокамі, тупаюць у траве.
Аж цэлы месяц сядзелі на яечках,
пасля праз два малых выводзілі над рэчку,
смачным, што самі елі, і дзяцей кармілі,
як паляваць і лётаць добра іх вучылі.
Распусцяць крылы
— будзе больш двух метраў,
а калі разам уздымуцца ў паветра,
свой трубны голас далучаць да сяброў,
каб адляцець ад снегу і вятроў.
Крур-р-р-крур-р-р, курлы-кур-рыл...
А з-па-над Нарвы, знізу, айцец Гаўрыіл
на добры шлях ім памахае з Кудака.
Чакаць іх будуць людзі, луг, поле і рака.

Музыка з кайфам

Чароўны Юрка!

Калі думаем „Еўрабачанне" — бачым эстраду. Калі думаем „эстрада" — бачым вялікую сцэну, святло, прыгожых зорак ды песні пра каханне. Найчасцей гэта не прынцып каб спяваць пра каханне, але наогул так атрымліваецца. Калі аднак на эстрадзе спяваюць дзеці, выбіраюць тэму сяброўства, мамы, гульні, казак. А калі б вас спытаць пра казкі? Якая першая ўспамінаецца? Мне „Маленькі прынц", а нават „Аліса ў краіне цудаў". Кажуць, што гэта такія казкі для дарослых, але распавядаюць і пра ўяўленне, і пра самыя простыя праўды. Дзеці, моладзь — іх козырам з'яўляецца ўяўленне. Гэтыя рысы паказаў у сваёй песні „Чароўны кролік" таксама *Юрка Дземідовіч*, 12-гадовы хлопчык з Мінска. Звычайны хлопчык з незвычайным талентам.

Песню падрыхтаваў на конкурс „Песня для Еўрабачання", дзіцячага спаборніцтва ў галіне эстраднай песні. „Чароўны кролік", зразумела, разам з *Юркам*, паедзе на фінал конкурсу ў Кіеве, які адбудзецца 21 лістапада г.г.

— Што за дзіва? — часта думаюць тыя, якія пабачаць у інтэрнэце гэтае выкананне.

Маюць права запытаць. На экране спявае элегантна апрануты хлопчык. Большасць слоў амаль дэкламуе, некаторыя словы зусім незразумелыя, нібы лацінскія, але адкуль яны ў песні? За момант атакуюць слухача цяжкія гітарныя рытмы, а пасля спявае хор, на фоне якога чуем цудоўны оперны голас малога выканаўцы. „Эціс! Аціс! Амаціс!" — прыдумаў на адкрыццё песні *Юрка*. Яго ўяўленне здаецца быць далёка, далёка ад нашай рэчаіснасці. А спалучэнне розных жанраў? — кажуць крытыкі што гэта вынік свабоды, якую далі *Юрку* бацькі. А „Чароўны кролік"? — можа гэта сам Юрка, для некаторых незразумелы, падазроны, недзіцячы? Мне здаецца, што гэта „кролік" *Юркі* ў краіне цудаў.

Дзякуючы гэтай песні *Юрка Дземідовіч* нарабіў сапраўднага балагану ў беларускай музыцы, а да гэтага яшчэ апанаваў інтэрнэт. Ёсць фан-клубы, ёсць вялікія дыскусіі, ёсць „трусаманія". Трусаманія! Не „кролікаманія". Па-беларуску кролік гэта трус і пра гэта беларускія фанаты хлопчыка не забываюць. А вы паслухайце „Чароўнага кроліка" (http://music.fromby.net/article/1850/ або http://www.youtube.com/watch?v=EBvXP204exs) ды ўвайдзіце ў свет свайго прыватнага ўяўлення!:)

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 39

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 34:

Запалка, ух, клас, ліст, люстэрка, жыта, ар, каронка. Ключык, ліс, та, пласт, ар, стэп, Ян, куртка, ах, арка.

Узнагароду— кампакт-дыск з беларускай музыкай выйграла **Юстына Вакулюк** з Арэшкава. Віншуем!



Ігар Сідарук

ПАЦАЛУНКІ ВЕТРУ

— Хачу пакатацца на веласіпедзе, — сказала ты раптам, калі я неяк ранкам дастаў свой стары добры велік, каб давесці яго, што называецца, да чалавечага стану.

— Але ж ён... — толькі паспеў адказаць, як у наступнае імгненне мой язык быў заціснуты паміж тваімі зубкамі, а твая рука ўпэўнена і натхнёна сціскала яўна не рычаг ручнога тормазу. Дый адкуль яму было ўзяцца ў сініх мужчынскіх джынсах, крыху выгарэлых на летнім сонцы?.. Гэтае ж сонца кранула інтымнай гарэзнасцю і твае валасы, якія цяпер крыху казыталі мае шчокі. Я лавіў гэтыя смешныя, залатыя кудзерыкі пальцамі, адчуваў іх шаўкавістую пругкасць і ўжо проста не мог думаць пра нейкі банальны веларамонт ці тым яшчэ збіраўся заняцца з самае раніцы, якое нахабства!.., без цябе, мілая.

Аднак яшчэ большым нахабствам было б не адказваць на вільготныя, бязгучныя дотыкі тваіх вуснаў, якія без усялякіх слоў прасілі адчаю, агню, немагчымасці, нарастаючай развярэджанасці і дзіцячага непаслушэнства.

Тое, што гэтае непаслушэнства няспынна пульсуе ў цябе ў крыві, — я ведаў ужо даўно. Але не мог і блізка ведаць аб тым, што — сярод двара, сярод дамоў і сонца, сярод дрэў і свету, на старым, як і сам гэты свет, веласіпедзе — можна займацца гэтым. І кожны раз, кожны бясконцы, адказны, спапяляюча-легкадумны раз — усё адбывалася ўпершыню.

І ўпершыню мы паехалі разам на гэтым разабраным, расшрубаваным веліку; паехалі, не ведаючы і не адчуваючы, што націскаем і куды кіруем, дзе імчымся і куды выедзем.

Вось лес, паплавы, аблачыны — усё ніжэй, усё далей. І ты смяешся шчасліва, на табе з усяго адзення — толькі кроплі ранішняе расы, урэшце, на мне не нашмат болей, калі не лічыць ліпавую крылатку на згібе локця; але яна мне не перашкаджае, як не перашкаджае твой смех, твае лапаткі-крыльцы, што ўпіраюцца мне ў грудзі, твая адкрытая шыя, якую так зайздросна прыгожа цалуе вецер, нібы чужую жанчыну, і да якога я самазабыўна, дзіка раўную, хоць і не паказваю выгляду...

Так, ты сядзіш на веласіпеднай раме да мяне спінаю; але ўсё роўна я бачу твае вочы — твае пранікнёныя, разлітыя шэра-зялёнымі азёрамі вочы, дзе сабраны і настоены самы моцны і выбуханебяспечны канцэнтрат: водар і сумесь язмінна-ліпавай кветкавай пяшчоты, летняй пажаднай спакусы, тых няўлоўных пачуццяў, сутнасць якіх можа перадаць праз свае пацалункі толькі лёгкі ліпеньскі вецер.

І якая нам справа, што на гэтым веласіпедзе — адбітая частка руля, крывыя, памятыя колы і ўвогуле няма ланцуга?!.

02.07.2009.

Беласток — Гродна ў шаснаццаты раз

У Звярынецкі парк 13 верасня г.г. з усіх бакоў Беластока папоўдні ў сонечную нядзелю прыбывалі тлумы. „Ідзем на беларускае таварыства!" — паведаміла мне старэйшая пара, якая напрасткі спускалася на паляну з высокага берага вуліцы. А „таварыства" было беларуска-польскае — на сцэне прэзентавалася дзевяць польскіх ансамбляў з Гродзеншчыны і дванаццаць беларускіх з Падляшша, агулам каля трохсот артыстаў, не лічыўшы тутэйшых і тамашніх мастакоў і мастакоў-рамеснікаў, якія расклалі сваю багатую прапанову пад інтарэс наведвальнікаў мерапрыемства. Апрача песні, якая заўсёды прываблівае на падобныя фестывалі верных аматараў прыгожых твораў прыкладнога мастацтва, як заўсёды прапануецца і кніга — Янка Заброцкі прывёз з Варшавы вялікі выбар кніг пра беларушчыну, славяншчыну ды праваслаўе, а беластоцкія беларускія аўтары з немалым выбарам сваіх кніг чакалі аматараў роднага слова. Мерапрыемства праводзіцца пераменна ў Беластоку і Гродне, і мае сваіх прыхільнікаў сярод гледачоў і арганізатараў, перш за ўсё сярод мясцовых самаўрадаўцаў. З нашага боку галоўным арганізатарам з'яўляюцца Беларускае грамадска-культурнае таварыства ды Таварыства беларускай культуры пры падтрымцы Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі, ды Упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама. Падтрымалі мерапрыемства горад Беласток, Маршалоўская ўправа Падляшскага ваяводства, Культурны цэнтр Беларусі ў Беластоку пры Пасольстве Рэспублікі Беларусь. Мэтай Фестывалю польскай і беларускай песні з'яўляецца развіццё кантактаў, сяброўства і супрацоўніцтва паміж меншасцямі польскай у Беларусі і беларускай у Польшчы, а таксама паміж народамі і дзяржавамі. Вядома, старшыні БГКТ Яну Сычэўскаму польскімі журналістамі было пастаўлена пытанне з якім Саюзам палякаў у Беларусі супрацоўнічала БГКТ пры агранізацыі фэсту — „слушным" ці „няслушным". Старшыня адказаў, што гаворка тут не пра „новы" ці „стары" саюз, але аб асяроддзях, якія не мусяць палітычна ці арганізацыйна атоесамлівацца з гэтымі саюзамі, а хочуць дзейнічаць у культуры, асвеце і маюць у гэтым заслугі, а сабралі іх на гэты фэст арганізатары.

„Знічка" з Гайнаўскага белліцэя

„Белавежцы"

У фестывальным канцэрце выступілі таксама моладзевыя і дзіцячыя ансамблі з беларускага і польскага бакоў. Наймалодшымі былі калектыў „Вясёлка" з самаўрадавага дзіцячага садка № 14 у Беластоку (кіраўнікі: Анна Бабік і Данута Тымашэвіч) ды „Ютшэнка" з Ваўкавыска (кіраўнік Ала Пачакайла) ды моладзева-ліцэйская „Знічка" ў новых беларускіх строях (кіраўнік Бажэна Ляўчук). Моладасцю ззялі беластоцкія „Каласкі" (кіраўнік Ала Каменская), „Калінка" (кіраўнік Марыюш Харужы), сямейнае трыо з Макаўкі (кіраўнік Анна Пятроўская). Шмат моладзі выступае ў ансамблях „Kresowe Zabawy" (кіраўнік Вольга Лоўкісь), „Słoneczne Promienie" і „Andżelika" з Ліды (кіраўнік Ала Карэйва). Выступілі хары — хор польскай песні „Promień" са Шчучына (кіраўнік Аляксей Мінай), хор „Крыніца" з Беластока (кіраўнік Віктар Маланчык), хор „Васілёчкі" з Бельска-Падляшскага (кіраўнік Мікола Фадзін), хор „Куранты" з Бельска-Падляшскага (кіраўнік Аліна Негярэвіч), фальклорныя калектывы — „Рэчанька" з Козлікаў (кіраўнік Ала Каменская), „Kresowiacy" з Ліды (кіраўнік Часлаў Янушкевіч), вакальны ансамбль „Вішанька" з Путрышак Гродзенскага раёна (кіраўнік Станіслава Звалінская), эстрадны калектыў „Vegas" з Грабоўкі каля Беластока (кіраўнік Пятро Кажан), „Шкляры" з Бярозаўкі Лідскага раёна (кіраўнік Андрэй Барыла), Падляшская капэла з Сямятыч (кіраўнік Зянон Селеваноўскі) з Маркам Скамароўскім, які ўслаўляе наша Падляшша і беларускую песню на ўсю Польшчу. У фінале ўсе выканаўцы ды публіка разам праспявалі дзве песні — „Piękna nasza Polska cała" ды „Люблю наш край старонку гэту". У рамках фестывалю ў выставачнай зале Культурнага цэнтра Беларусі (вул. Модлінская, 2, у Беластоку) адбылося адкрыццё фотавыстаўкі „Імгненні гарадзенскай прыгажосці" Народнага фотаклуба „Гродна".

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Крыху традыцыі

Тэкст і фота
Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Аўтобусны прыпынак у Голіках, што на захадзе Сідранскай гміны, устаноўлены ў сярэдзіне не надта доўгай вёскі. Першае ўражанне, яшчэ ў салоне аўтобуса, не настройвае аптымістычна: на вуліцу наступае зелень, а гэта можа абазначаць, што вёска зарастае, што ў насельнікаў тамашніх панадворкаў няма сіл супрацьстаяць выліваючайся аж на вуліцу прыродзе. Позірк з прыпынку навонкі вёскі паказвае, што прырода можа і наступае на некаторыя панадворкі, але за загуменнямі земляробы яшчэ там не здаюцца. Вось паша рупліва разгароджаная яшчэ традыцыйна-сучаснымі платамі з драўляных слупоў і металічных „жэрдак". У пачатак Голікаў не вяртаюся, але ў той палове вёскі, якую праходжу ў паўночным напрамку, агароджы здаюцца быць багацейшымі ды выяўляюцца два панадворкі з шыльдамі граеўскага малочнага завода, а гэта абазначае, што прынамсі двух гаспадароў мае ўласныя студзільнікі малака і трымае большыя статкі кароў.

Крыж за Голікамі

Вёска Раманаўка таксама не надта вялікая, мо нават крыху меншая за Голікі. І тут відаць тое, што і ў навакольных вёсках — яна паволі згортваецца...

Капліца ў Красным

Гаспадарчы будынак у Раманаўцы

Перапёлка

Зараз за вёскай маю ўвагу засяроджвае каваны металічны крыж на каменным пастаменце. Без даты ён, але гэта можа і добра, што ахвяравальнікі не прыводзяць там сваіх зямных спраў, уліку гадоў, але засяроджваюцца на важнейшым — на пазбаўленай храналогіі вечнасці. І сам той крыж рупліва выкананы канкрэтнымі людзьмі ў працэсе доўгай працы-малітвы, не тое, што модныя цяпер гіганцкія крыжы, выкананыя ў дэгуманізаваных металургічных заводах, пастаўленыя з фармальным рытуалам.

Тры-чатыры сотні метраў за Голікамі бачу чарговы крыж, цэментны, побач дарожкі на недалёкі хутар. Гэты крыж на свой лад уквечаны — менавіта над ім пахіляецца куст бэзу, які ад імя ягонага насаджальніка выконвае ролю веснавога кадзіла. У драўлянай агароджы царыць зелень бэзавых парасткаў, а навонкі той агароджы радочак пасаджаных гваздзікоў.

А з другога боку асфальтоўкі бярозавы, мо дваццацігадовы зараснік, якім зарастае студня з бетонных кругоў; ці быў там раней панадворак, ці мо паша — цяжка здагадацца. І ў невялікай аддаленасці ад гэтага месца стаіць апусцелая хата, з цэментным крыжам перад ёй.

Зараз за Раманаўкай сцяна лесу... Той лес цягнецца паралельнай да дарогі з Саколкі ў Дуброву паласою, адлеглай ад той дарогі ад пяці да сямі кіламетраў. Паласы той будзе мо з трыццаць кіламетраў даўжыні і, у сярэднім, два кіламетры шырыні. Не ўмею здагадацца, чаму той лес — рэштка колішняй Гарадзенскай пушчы — там астаўся; магчыма, што дзеля магнацкіх паляванняў, бо ж 16-вечны ўласнік Сідры Рыгор Валовіч быў лоўчым літоўскага гаспадара — вялікага князя.

Каля кіламетра ад Раманаўкі, побач скрыжавання лясных дарог, абгароджаны невысокім драўляным плотам участак памерам за ар. Усярэдзіне, пад вялікім дубам стаіць некалькі выгарэлых лампадак. На тапаграфічнай карце пазначана ў тым месцы магіла, аднак на месцы — апрача згаданых лампадак — ніякіх прымет магілы няма. Няма там ніякага рэлігійнага сімвала, нават невялікага крыжыка, нейкага арла, чырвонай зоркі... Няма таксама ніякай інфармацыі, што такое ў тым загароджаным участку...

Грэшны яблык пазнання ўсё ж такі спакушае мяне. На тапаграфічнай карце гэтага ўчастка лесу пазначаны нейкі таемны падоўжны аб'ект па лясной дарозе, што адыходзіць ад засакрэчанай загарадзі на поўдзень; кіруюся туды за сваёй цікавасцю: мо гэта нейкі асаблівы ярок — падумалася мне. І так сабе іду, нічога асаблівага не заўважаючы. Дарога шчыльна аброслая грабамі, дзе-нідзе здараюцца елкі, дубы, бярозы. Ёсць і некалькі невялічкіх лядаў, але нічога асаблівага — вартага ўвагі. Так даходжу да лясной жвіроўкі, якая пралягае з Раманава ў бок Янава, і мая дарожка там канчаецца, а яе прадаўжэннем паказваецца невялікі насып, акурат такі, па якіх некалі пракладалі па нашых лясах вузкакалейкі. На цяперашніх картах Кнышынскай пушчы пазначана адно вузкакалейка ад шырокачыгуначнай станцыі Валілы каля Гарадка праз Букшталь, Чорную-Беластоцкую пад Копіск. Магчыма, што тых пуцей было там раней больш. Магчыма, што рэйкі былі там пакладзены тымі ж самімі аматарамі драўніны, якія пасеклі імі і Белавежскую пушчу. На сайце Чорнабеластоцкага надлясніцтва агульна згадваецца пра драпежніцкае гаспадаранне ў тамашняй пушчы акупантамі перыяду сусветных войнаў, аднак канкрэтаў не прыводзіцца. Магчыма, што некаторыя з пакладзеных там у дасанацыйны час рэек з сілезскіх ці рурскіх канцэрнаў Крупа былі ў міжваенны час зняты з мэтай пераплаўкі іх у міжрэччы Віслы і Сана... Бо на карце Кнышынскай пушчы пазначана лясная дарожка — прадаўжэнне таго „майго" насыпу — у бок Чорнай-Беластоцкай, якая магла астацца ад былой вузкакалейкі...

Выходжу з лесу на захад, абмінаю вёскі Малы і Вялікі Цесніск; назвы гэтых вёсак падказваюць іх грамадскія клопаты ў мінулым і моўны абшар, з якога яны ўзяліся. А абмінаю іх таму, што выхады з іх не супадаюць з планам майго далейшага маршу. А кіруюся я ў вёску Краснае. На яе задворках самотная маладая жанчына, апусціўшыся на калені, выбірае выараную бульбу. Гэты сюжэт навеяў мне думку пра свайго роду спецыялізацыю, падзел прац на „жаночыя" і „мужчынскія". Ну, мужчына бульбу выворвае, але ж гнуцца яе збіраць яму не гонар — гэта бабская работа. Магчыма і другое — мужык павёз памяняць выкапаную бульбу на грошы. Час ад часу заглядаю на новы беластоцкі базар, што па вуліцы Андэрса, а там бульбу ў мяшках, проста з машын, прадаюць толькі мужчыны; жанчына, відавочна, павінна быць бліжэй хаты, у яе традыцыйным коле заняткаў тры „к": кухня, касцёл, карапузы...

Сама вёска Краснае можа і была „краснай" калісь; сёння яна выглядае так як і іншыя вёскі, у якія яшчэ не завітала мода на панібрацтва гарадскіх паноў з прыродай. Тут яшчэ няма выстрыжаных касілкамі панадворкаў, няма там пластмасавых гномаў ні такіх жа буслоў — вёска гэтая яшчэ вясковая. Праўда, у сонечны дзень на брукаванай вуліцы пуста, пад адной з хат прысела старэнькая бабулька. Хачу завесці з ёю размову, але яна ветліва мне адказвае, што амаль нічога з былога не помніць, што нядаўна была ў шпіталі захварэўшы на сэрца і цяпер слаба чуе...

Мураваная каплічка з не надта даўно вылітымі бетонам усходкамі выглядае неяк адлюдна. Пустакі ў ёй здаюцца бясколернымі, са шпаркамі паміж імі. На паўднёвым канцы Краснага ў засені дрэў дрэмле будынак былой школы. І хаця ён у адлюдным месцы, аднак ніхто там не паважыўся здзекавацца над ім. Дзе мне не прыходзілася бачыць такія менш ці больш запушчаныя будынкі, усюды быў след нейкага вандалізму. У Красным вельмі мяне задзівіла тое, што да грамадскага дабра, якім тут былая школа, мясцовыя людзі адносяцца з пашанай — ніводнай выбітай шыбы ў даўно пустуючым будынку!..

працяг ☞10

9 ☞працяг

Крыху традыцыі

За вёскай, з другога боку шашы абгароджаны комплекс-помнік былога будавання шчаслівай калектыўнай будучыні. У адміністрацыйным будынку нехта жыве, гаспадарчыя будынкі пустуюць, раскіданая бензакалонка. Пры асфальтоўцы чыгунны помнік з 1882 года з малітвай за жывых і памерлых. У Трафімаўку заглядаць мне не хацелася, бо і там яшчэ — так мне падалося — вяскоўцы жывуць па прывычцы.

Перад Янавам забіла мне шпарчэй сэрца, бо ў прылягаючым да шашы полі пабачыў я аб'ект, якога не сустракаў мо з трыццаць гадоў. На краю ўзрыхленай ужо пожні стаяла перапёлка. Праўда, занадта яна не красавалася, бо ўжо бадай толькі адна кветка ў ёй яшчэ вылучалася жывым колерам, іншыя ўжо павысмоктвалі са сваіх сцёблаў усемагчымыя сокі і паволі блякнулі, высыхалі. Але захапіла мяне тая прывязанасць да земляробчай традыцыі, якая з прымяненнем сельскагаспадарчых машын стала амаль паўсюдна знікаць з нашых палёў. Бо ўквечаная перапёлка гэта свайго роду падзяка прыродзе за сабраны ўраджай і замова такога ж на будучыню. Вось што пра яе пісаў Зыгмунт Глогер: „[Przepiórką] zowie lud ostatnią garść zboża niezżętego w końcu pola. Kępkę taką kłosów podczas wicia wieńca dożynkowego związują żniwiarki u góry, dołem zaś oczyszczają ziemię z chwastu i na płaskim kamyku kładą pośrodku kawałek chleba. Wszystko to robią, jak każe odwieczny symboliczny zwyczaj, aby zboże było tak czyste w roku przyszłym i chleb z tegorocznego wystarczył do żniw następnych a przepiórka miała kłosy dla siebie." Гэта і спрадвечны звычай, і сціплы вянок. А які сучасны звычай? Сучасны звычай гігантаманскі, дажынкі ўсялякія: і цэнтральныя, і ваяводскія, і павятовыя, і гмінныя... Сакольскія павятовыя дажынкі сёлета былі спланаваны ў Крынках, з абодвума рэлігійнымі абрадамі ў абодвух тамашніх храмах. А вось нашы ваяводскія дажынкі адбыліся сёлета таксама ў бадай двух храмах: адзін абрад правіўся ў Высока-Мазавецку, а другі ў Браньску; сказаць можна, што маліліся там od Sasa do lasa. А земляробы і так пабачылі ўсю гэтую сучасную „перапёлку" ў адным тэлевізары...

Касцёл у Янаве

У Янаве галоўным аб'ектам з'яўляецца мураваны касцёл, здадзены ў карыстанне ў 1905 годзе; раней там была драўляная капліца з 1725 года. Касцельная гісторыя Янава даволі цікавая. У пачатку 18-га стагоддзя Янаў не быў самастойнай парафіяй, была тут філія Карыцінскай парафіі. У 1744 годзе кнышынскі дэкан выступіў да віленскага біскупа з патрабаваннем ліквідаваць філію ў Янаве і ўключыць яе ў склад Карыцінскай парафіі, грунтуючы патрабаванне тым, што капліца была ўзведзена без дазволу біскупа. Аднак віленскі сінод зрабіў наадварот — устанавіў у Янаве самастойную парафію. Сітуацыя амаль паўтарылася ў канцы XIX ст., калі выкананне дазволу самога цара на змураванне новага касцёла спыніў гродзенскі губернатар, грунтуючы сваё рашэнне тым, што за новую пабудову хадайнічалі не парафіяне, але адно пробашч; два гады заняло хадайніцтва за адмену гэтай адмовы. А згаданы пробашч, Рышард Кнобельсдорф, апынуўся ў ссылцы ў Пскове...

Вельмі цікавая прыкасцельная капліца чвэрцьшаравага кшталту, змураваная з камянёў, якіх поўна на навакольных палях.

Насельніцтва Янава публічна размаўляе па-польску. Але ў прыватнасці, паміж сабою, тамашнія людзі гутараць па-просту. Цікавая яшчэ адна моўная з'ява: вось хлапчукі, што вучацца ў тамашняй гміннай школе, таксама ў сваёй прыватнасці „шпануюць" на той мове, на якой дома яшчэ размаўляюць іхнія бабулі.

Яшчэ адзін цікавы знак грамадскіх перамен заўважыў я ў Янаве. Насупраць вялікага будынка гміннага комплексу школ месціцца менш імпазантны комплекс геэсаўскіх будынкаў. Але гандаль у Янаве апанавалі прыватнікі і былы лідар вясковага гандлю прыйшоў у заняпад. Цяпер у будынку, дзе калісь было геэсаўскае бюро, усяляецца пахавальная фірма.

Традыцыя ў Янаве і трымаецца, і мяняецца.

Сапраўдныя беларускія нацыянальныя сімвалы сёння ў загане. Дакладней, у загане ў цяперашняга кіраўніцтва Беларусі, якое ў 1995 годзе не пагрэбавала парваць бел-чырвона-белы сцяг на галоўным адміністрацыйным будынку краіны на маленькія кавалачкі. Але бел-чырвона-белы сцяг і герб „Пагоня" таму і ёсць сапраўднымі сімваламі, што застаюцца ў душы беларусаў, нягледзячы на знікненне з урадавых кабінетаў.

Пэўна з такіх прычын і спрабуюць данесці прыхільнікі ідэі нацыянальнага адраджэння звесткі аб сцягу і гербе праз інтэрнэт. Адной з такіх спроб ёсць сайт **http://sciah.info**, дзе месціцца падрабязная інфармацыя аб нашых сімвалах.

Выглядае сайт вельмі прывабна — адразу бачна, што вэб-дызайнеру не ёсць незнаёмай гэтая тэма і ён прыклаў дастаткова намаганняў, каб уласна сайт выглядаў як нейкі сімвал. Магчыма, з такіх меркаванняў на галоўнай старонцы месціцца фотаздымак Васіля Быкава і тэкст ягонай нататкі пра бел-чырвона-белы сцяг і герб „Пагоню". „Шчасьце беларусаў у тым, што гэткая сымболіка ў нас ёсьць, яна дайшла да нас ад сівой даўніны. Але яе ў нас скралі, нахабна абрабавалі нацыю, што страшней за эканамічны рабунак і аналягічна нацыянальнаму генацыду", — казаў калісьці сапраўдны народны пісьменнік. Ён выдатна ведаў, што герб і сцяг — гэта не проста сімвалы, гэта праяўленне душы народа і, нават, частка народнай душы.

Ніжэй на старонцы змешчаны даволі падрабязны расповед пра ўзнікненне сімвалаў, а з правага боку, што крыху неардынарна, месцяцца выйсці да іншых рубрык.

Паколькі рубрыка „Гісторыя" пэўным чынам бярэ свой пачатак яшчэ з галоўнай старонкі, дзе закранаюцца розныя чыннікі з'яўлення сімвалаў, то ёсць сэнс адразу звярнуцца да старонкі, якая мае інтрыгуючую назву „Значэнне". Вось тут ідзе сапраўдная філасофская атака, якая мусіць разграміць ушчэнт усе сумненні адносна „Пагоні" і бел-чырвона-белага сцяга як нашых нацыянальных сімвалаў. Менавіта на гэтай старонцы мы знойдзем артыкулы Паўла Севярынца, Зянона Пазьняка, Ніла Гілевіча і Алеся Чайчыца пра хрысціянскае значэнне бел-чырвона-белага палотнішча, ягоную прыгажосць і нават містычнае прызначэнне. „Кляўстрафабічная атмасфэра таталітарнага Менску ажыўляецца, як толькі гэтую душную „матрыцу" працінае бела-чырвона-белае палотнішча ў руках таго, хто асьмеліўся падняцца за сваю чалавечую годнасьць. Нацыянальны штандар над уваходам у сядзібу БНФ — як дзірка ў прасторы і часе, а дзьверы пад ім — бы партал у іншую рэальнасьць, у выспачку свабоды і надзеі пасярод апошняй эўрапейскай дыктатуры", — уражвае сваімі ўяўленнямі аб сцягу Алесь Чайчыц.

Нягледзячы на тое, што ўжо мінуў той час, калі нацыянальныя беларускія сімвалы былі яшчэ і дзяржаўнымі, тым не менш уладальнікі сайта палічылі важным пазнаёміць яго наведвальнікаў з адпаведным палажэннем, які прыняў калісьці беларускі парламент. Каб прачытаць гэты ўжо нядзеючы закон, трэба завітаць на старонку „Закон".

Не пакінулі ўладальнікі сайта і так званы практычны бок. У рубрыцы „Для спампавання" месцяцца выявы сімвалаў і песні пра іх, якія можна перанесці на іншы носьбіт інфармацыі.

Старонка „Як пашыць сцяг" дае парады, як найлепей стварыць беларускі нацыянальны сімвал уласнымі рукамі.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Маленькія радасці

Слава беларускага гандбола пакуль застаецца толькі ў мінулым. Сённяшнія будні айчыннага ручнога мяча пераважна маюць руцінны характар і толькі час ад часу здараюцца маленькія святы. Такое, прыкладам, якое здзейсніў для сваіх прыхільнікаў мінскі СКА, які па-ранейшаму трэніруе легендарны Спартак Мірановіч. У першым паядынку кваліфікацыйнага раўнда Кубка ЕГФ беларусы саступілі ў гасцях эстонскай „Пыльве" з розніцай у шэсць мячоў — 22:28. Дома быў патрэбен маленькі подзвіг і цяжкае заданне было выканана — хатняя вікторыя з лікам 32:22 адкрыла для СКА дарогу ў наступны этап. 14 галоў у гэтай сустрэчы закінуў паўсярэдні Сяргей Гоўша. Услед адбылося лёсаванне другога раўнда гэтага турніру — другога па значнасці ў кантынентальнай класіфікацыі. Паводле яго сапернікам мінскага „Дынама", якое не здолела выйсці ў Лігу чэмпіёнаў, будзе турэцкі клуб „Мілі Піянга". СКА давядзецца гуляць з загадкавай кіпрскай камандай — „Стровалаcам" з Нікасіі.

Тым часам распачаўся нацыянальны чэмпіянат. У мужчынскім турніры змаганне вядуць 9 каманд: „Дынама" (Мінск), БГК імя Мяшкова (Брэст), СКА (Мінск), „Машэка" (Магілёў), ГГК (Гомель), „Вікторыя-Рэгія" (Мінск), „Аркатрон" (Мінск), ГК імя Левіна (Наваполацк) і „Кронан" (Гродна). Па выніках двух кругоў гульняў мацнейшая шасцёрка з улікам набраных паміж сабой ачкоў сфармуе так званы прыма-пул „А". На другім этапе пройдуць таксама два кругі. Прэтэндэнтамі на золата з'яўляюцца толькі дзве каманды — дынамаўцы і мяшкоўцы. Стаўкі чэмпіёна выглядаюць вышэй, але і клуб з горада над Бугам мае немалыя амбіцыі. У ім ажно дзесяць легіянераў, дынамаўцы маюць у шэрагах больш беларусаў, але таксама заявілі пяць замежных майстроў. Сярод іх варта вылучыць галкіпера Андрэя Шыпенку з Украіны, паўсярэдніх Марціньша Лібергса з Латвіі і Марыа Марэціча з Харватыі. На бронзу найперш будзе прэтэндаваць СКА, канкурэнцыю яму могуць скласці „Машэка" і „Вікторыя-Рэгія". Астатні квартэт будзе вызначаць аўтсайдараў.

Стартаваў і гандбольны чэмпіянат Беларусі сярод жаночых калектываў. Усяго ў першынстве бяруць удзел таксама 9 клубаў, якія прадстаўляюць усе шэсць абласцей. Поўны пералік спаборнікаў такі: мінскі БНТУ, „Гараднічанка", бялыніцкая „Друць", мінскі „Аркатрон", бабруйская „Беразіна", „Бярэсце", Гомельскі гандбольны клуб, сталічная „Вікторыя-Рэгія" і „Віцебск-Ганна". Адзначым, што віцебская каманда „Васіліна" змяніла сабе імя, узяўшы новае з беларускім правапісам.

Бясспрэчнымі фаварыткамі спецыялісты называюць чэмпіёнак краіны сталічных студэнтак. І сапраўды БНТУ ўзмацніўся — з дэкрэтнага адпачынку выйшлі Ірына Арцёменка і Наталля Сакалоўская (да замуства Майлычка) — абедзве выступалі за зборную Беларусі. А вось асноўны канкурэнт чэмпіёна — „Гараднічанка", наадварот, аслабла. З берагоў Нёмана ад'ехалі асноўная брамніца Алеся Корабава — у турэцкую „Анкару" і распасоўшчыца Ірына Магіліна — у сербскую „Кікінду". „Друць" хутчэй за ўсё будзе трэцяй. Бялыніцкія дзяўчаты першымі стартавалі ў кваліфікацыі Кубка ЕГФ і прайшлі гэты этап паспяхова — яны двойчы разграмілі ізраільскую каманду „Бней-Герцлія" і выйшлі ў наступны этап. Маленькая, але радасць.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Вілінаўскія жанчыны

Вілінава гэта адно з большых салэцтваў у Мельніцкай гміне. Раней вёска налічвала 176 гаспадарак. Зараз заселеных засталося восемдзесят чатыры дамы. Апошнія „памерлі" сваёй смерцю. Самым старэйшым жыхаром вёскі з'яўляецца Сяргей Стрэльчук. Па пашпарце яму 99 гадоў. Сам на ровары яшчэ ездзіць. Карыстаецца добрым слыхам і зрокам. Старажыл пахаваў ужо сына і жонку.

Вілінава ў Мельніцкім самаўрадзе прадстаўляе солтыс Яўген Высоцкі. Цешыцца ён пашанай у аднавяскоўцаў. Ужо пяць тэрмінаў працуе на пасадзе солтыса.

Самадзейнікі перад Чаромхаўскім ГОКам

У Вілінаве, як у большасці прыгранічных вёсак, гаспадарка складае асноўную крыніцу даходу. Зямля тут якасная, дык прыносіць добры плён. Праўда, зараз земляробчай працай займаюцца адно пенсіянеры, хоць афіцыйна маёмасць перапісана на іхніх дзяцей (так раней на вёсках рабілі, дзеля таго, каб атрымаць сельскагаспадарчую пенсію). Праязджаў я аднойчы ў Такары праз Вілінава і любаваўся акуратна задбанымі сялібамі. Значыцца, што жыве тут працавіты і згодны народ.

У вёсцы ёсць клуб. Збудавалі яго пры камуне сяляне ў грамадскім пачыне. Ініцыятыву перадаў загадчык мясцовай школы спадар Мартыновіч. Тут калісьці дзейнічаў гурток вясковых гаспадынь, які ўзначальвала Лідзія Тымашук. Пры КВГ існаваў пункт пракату пасуды. Карысталіся ім не толькі жыхары Вілінава, але і навакольных вёсак. Жанчыны былі перадавікамі ў грамадскай працы. Арганізавалі навучанне варэння і пячэння, апрацоўкі мясных вырабаў. Збіраліся на вячоркі. Гурток КВГ спыніў дзейнасць ў пачатках трансфармацыі, г.зн. у пачатках дзевяностых гадоў. Пасля святліца стала месцам вясковых сходаў ды вясельных гулянак. У мінулым годзе штосьці зварухнулася. А штуршок далі...жанчыны. Паслухайма затым, што самі скажуць.

— Задумалі мы арганізаваць вакальны калектыў, — пачынае Леакадзія Саўчук, аўтарка задумы. — Было гэта ў лістападзе мінулага года. Упершыню выступілі ў студзені г.г. у Сямятычах на аглядзе калядак. Паколькі не мелі назвы гурту, дык канферансье прэзентаваў нас як калядны калектыў. Афіцыйныя „хрысціны" святкавалі 6 лютага, калі прынялі назву „Верасы". Адкуль такая назва — сама не ведаю. Пэўна з натуры ўзялася. Арганізаваліся восенню, як верасы цвілі... Першае выступленне і першы поспех. Мы заваявалі вядучае месца, затым паехалі ў Гайнаўку. Там на трыццаць чатыры калектывы занялі сёмае месца. У чэрвені канцэртавалі на аглядзе ў Бельску-Падляшскім, дзе сярод пяцідзесяці шасці калектываў занялі трэцяе месца.

12 верасня выступілі з праграмай „тутэйшых" песень у Чаромсе. У рэпертуары знайшліся „Сыдзілі мы пад каліною", „жыта жала", „Там пад гаём", „Чыя то вэрба" ды іншыя.

Да вышэйсказанага можна яшчэ дадаць, што ўзрост удзельніц — ад 48 да 73 гадоў. Рэпетыцыі праводзяцца ў мясцовым клубе два - тры разы ў тыдзень, калі рыхтуецца праграма. Паколькі свайго музыканта няма ў Вілінаве, дык супрацоўнічаюць з Антонам Капелькам з Радзілаўкі. Гэта адзіны мужчына ў групе вілінаўскіх жанчын. Можна прытым адзначыць, што вялікую падтрымку амбітным самадзейніцам выказвае мясцовы радны Вітальд Тэрэбун. Гэта ён зараз хадайнічае за ўборамі для калектыву ў мельніцкага войта. Можна спадзявацца, што і дырэктар ГОКа Міхал Бараноўскі дапаможа вілінаўскім жанчынам, бо яны вартыя падтрымкі.

Уладзімір СІДАРУК

НАШЫ КАРЭСПАНДЭНТЫ

На бульбу ў Трыгарад

Мінула ўжо добрых некалькі гадоў, як апрача інтэграцыйных вандровак у чэрвені, беларусы Трыгарада спатыкаюцца на традыцыйным пячэнні бульбы ў Сопаце пры вуліцы Мікалая Рэя.

Як заўсёды, каб можна распаліць вогнішча ў Трыгарадскім ландшафтным парку, трэба мець згоду лясніччага Вальдэмара Бараноўскага з Лясніцтва Сопат Надлясніцтва Гданьск з сядзібай у Гдыні. Як штогод, па такую згоду на пачатку верасня еду веласіпедам некалькі кіламетраў на Лясную Паляну — так фармальна называецца вуліца, якая знаходзіцца на лясной паляне, у глыбі лясного комплексу. Не так то лёгка туды дабрацца на веласіпедзе, штогод цяжэй, праз стромкую лясную сцяну, на сетку лясных веласіпедных сцежак. Вядома наогул усім, што Сопат ляжыць над морам, але Грэнзова, кудою прабягае вуліца Лясная Паляна, ляжыць высока паміж горкамі. Каб крышку аддыхнуцца пасля такой вандроўкі, я спыніўся і пазнаёміўся з інфармацыйнай табліцай, што стаіць перад леснічоўкай спадара Бараноўскага.

Зацікавіла мяне на табліцы назва лясного комплексу: *Leśny Kompleks Promocyjny „Lasy Oliwsko - Darżlubskie"*. „Што значыць „лясны прамацыйны комплекс?" — пытаю лясніччага Бараноўскага. — Разумею слова „прамоцыя" калі ўваходжу ў маркет. Там нічога не купіш без прамоцыі, усе прадукты прадаюцца „з прамоцыяй", але лес — і прамоцыя? Гэта зусім нечаканае спалучэнне слоў!" — „Прамоцыя ў лесе заключаецца ў тым, — кажа спадар лясніччы, — што мы ў лесе не прымяняем хіміі, каб абараняць лес ад караеда-друкара. Стасуем натуральныя класічныя пасткі ў форме яловага пня ды феромонавыя".

Спадар Бараноўскі, скончыўшы Вышэйшую школу сельскай гаспадаркі ў Варшаве, з'яўляецца лясніччым ужо 33 гады, з таго ў Сопаце ён 20 гадоў. Наведвае ён Белавежскую пушчу прынамсі два разы ў год і з беларусамі, як сам кажа, пазнаёмлены не толькі на Узбярэжжы.

У суботу 12 верасня, пры найлепшым да пячэння бульбы надвор'і, спаткаліся беларусы з усяго Трыгарада, а прынамсі прадстаўнікі ўсіх гарадоў Трыгарада і недалёкага Прушча-Гданьскага. Печаная бульба з салёным сметанковым маслам смакавала! З вогнішча і бульбы найлепшыя ўражанні выказала пяцігадовая ўнучка А. Юзафовіча, дапытваючыся: „Калі будзе наступнае пячэнне бульбы?" — Пэўна, праз год!

Тэкст і фота Міхася КУПТЭЛЯ

Адгаданка

1. самаразгрузачны грузавік, 2. вясёлы Ноеў сын, 3. невялікі мяшок, 4. пастанова вярхоўнай улады, якой ахвотна карыстаюцца ў Мінску, 5. бацька Хама, 6. лірычны верш з чатырнаццаці радкоў, 7. травяністая расліна сямейства ароідных, *Acorus calamus*, 8. вялікі горад на захадзе Швейцарыі, 9. горад на рацэ Таха на поўдзень ад Мадрыда, 10. прозвішча „тэгеранска-ялцінскага" амерыканскага прэзідэнта, 11. селянін у даўняй Русі, 12. напр. „Аіда" Вердзі.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — валійская прыказка.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.



Адказ на адгаданку з 34 нумара

Дыла, кок, лес, Ной, Рэнуар, свет, Унеча, Ява.

Рашэнне: **Чалавек не вол, у адной скуры не старэе.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Агнешцы Чапко** з Сямятычаў і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,7 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 000 egz.

Ганна КАНДРАЦЮК

У Мастаўлянах усе нараджаліся маленкімі (5)

(пачатак ў 33 н-ры)

Толькі раз у жыцці я мела нагоду пачуць як беларускі мужык з сімпатыяй гаворыць пра Кастуся Каліноўскага. Звычайна мужык, асабліва наш праваслаўны, вешае на ім сабак. Рукі апускаюцца! Бо калі тое вешанне сабак спалучыць з ганаровай гібеллю на шыбеніцы змагара за шчасце мужыкоў, выходзіць нейкі гіпер-боль беларускага лёсу.

— Кастусь Каліноўскі, наш хлопец з вёскі, — сказалі нам дзядзькі ў Стаўрове на Віцебшчыне.

Мы былі ашаломлены, гісторыя-матка навучае іншаму. Хоць бы таму, што Каліноўскі нарадзіўся панам-шляхцічам у Мастаўлянах на нашай Свіслаччыне. І што мужыкі Віцебшчыны не праявілі вялікай цікавасці ісці ў паўстанне, наадварот, яны праявілі інтарэс дапамагаць царскім палкам душыць паўстанцаў-мяцежнікаў. Вікенцій Кастанцін Каліноўскі, паляк па крыві, з жахам глядзеў на беларускае самаедства. У рэшце рэшт паўстанне задушылі беларускімі мужыцкімі рукамі. Таму сімпатыя мужыкоў у бок Каліноўскага ў паўночна-ўсходняй частцы Беларусі, нягледзячы на факт што сустрэлі тут многа католікаў, паказалася падазронай. Але ў Стаўрове не пераймаліся нашымі дылемамі і не пераставалі хваліць Каліноўскага:

— Каліноўскі наш хлопец з вёскі, — паўтарылі з гонарам. — І нашы бацькі, і дзядзькі, яны ўсе пайшлі за паўстанцаў. І ўсё жыццё ўспаміналі і хвалілі тое паўстанне!

* * *

— Які чорт? — падумае чытач. Я сама доўга не разумела, што праўда пра Каліноўскага не на баку маткі-гісторыі, толькі на баку мастацтва. Гісторыкам цяжка адназначна палічыць паляка Канстанціна Вікенція Каліноўскага ўзорам героя-беларуса. Ён хутчэй жывое ўвасабленне ідэалаў французскай рэвалюцыі. На шыбеніцу пайшоў за волю і роўнасць усіх народаў, у тым ліку праваслаўных расіян і сербаў. У наш час вешаюць на ім сабак за знявагу праваслаўя. Калі перадумаць рэлігійныя погляды Вікенція Канстанціна Каліноўскага („Мужыцкая праўда" поўнасцю надрукавана ў інтэрнэце) — ён практычны атэіст, які цынічна выкарыстоўвае рэлігію ў палітычным змаганні. Апошнюю праўду добра зразумелі ў яго роднай рымска-каталіцкай парафіі ў Ялоўцы і на ўсякі выпадак затапталі ўсе сляды. Праўда, тут коле ў вочы яшчэ і беларускае пытанне, якое на роўні з іншымі народамі падняў з нашай багны Каліноўскі. За гэта Вікенцій Канстанцін быў зненавіджаны і адсунуты ад палітычнага цэнтра паўстання польскімі нацыяналістамі. Яго сімпатыя ў бок беларусаў была настолькі праўдзівай, што выклікала страх і кпіны заядлых палякаў. Пры канцы 1863 года Каліноўскага іранічна празывалі „Каралём Беларусі".

Любоў жыхароў Стаўрова да кіраўніка Студзеньскага паўстання таксама ўражвала шчырасцю і праўдзівасцю (як гэта прыгожа гучыць па-беларуску) — пачуццё мела найперш практычны характар.

* * *

Вікенція Канстанціна Каліноўскага ведаем найперш па мастацкіх і літаратурных творах.

У жніўні 2000 года разам з Ленай Глагоўскай і сябрамі мы наведалі Стаўрова, родную вёску віленска-беларускага мастака Пётры Сергіевіча. Мясціна вядомая і ў Польшчы з-за літаратурнага рамана Тадэвуша Канвіцкага пад загалоўкам „Богунь". Кніжка ўзяла загаловак ад імя маляўнічага возера, над якім распаложана вёска. У Стаўрове мы наткнуліся яшчэ на аматараў-краязнаўцаў з мястэчка Відзы. Моладзь, пад кірункам сімпатычнай настаўніцы Селязнёвай, збірала інфармацыі аб партызанах часоў айчыннай вайны. Пра Пётру Сергіевіча краязнаўцы даведаліся ад нас, хоць апошняя цікавінка не мела для іх практычна значэння. Ім загадалі даследаваць слушных патрызан і схіляць іх у бок, напрыклад, партызан, якіх маляваў Сергіевіч, не было спосабу. Сяляне, каб не сказаць лішняга, частавалі краязнаўцаў яблыкамі і адсылалі ў іншыя вёскі. Нас прыемна ўразіла спантаннасць з якой апавядалі пра Сергіевіча і яго «партызан». Як яны выглядалі прыездаў мастака! Бо славутыя карціны Сергіевіча: *Кастусь Каліноўскі і Валеры Урублеўскі робяць агляд паўстанцаў* і *Кастусь Каліноўскі сярод паўстанцаў 1963* намаляваны ў іх Стаўрове.

Кастусь Каліноўскі і Валеры Урублеўскі робяць агляд паўстанцаў

У мастацкім акце прымаў удзел цэлы калгас. Пётра Сергіевіч сябраваў са старшнёй калгаса, які на просьбу мастака, замест у поле, пасылаў калгаснікаў працаваць за «паўстанцаў». Мадэлі да канца жыцця ўспаміналі прыгоду з Кастусём Каліноўскім. Бо раней чым схапілі за косы і вілы, былі вымушаны скінуць з сябе настрой стомы і прыгнёту. У мастацкую атмасферу дапамагала ўваходзіць самагоначка і суп юха, якой славіцца Стаўрова. Трэба дадаць, што мастацкія пленэры адбываліся ў палове пяцідзесятых мінулага века, у часы страху, татальнай калектывізацыі і жалезных межаў.

— А хто працаваў як мадэль самога Кастуся Каліноўскага? — дапытваліся мы ў вяскоўцаў.

Апошняя справа не давала спакою, жыхары Стаўрова ў значнай колькасці нашчадкі расіян-стараабрадаўцаў.

— Вы самі яго добра ведаеце! Наш Пётра нават святых надзяляў сваім тварам, у адным касцёле ў Гродне святы Антоній з яго тварам...

— Цікава!

Толькі цяпер мы зірнулі на стаўроўска-паўстанцкія карціны новымі вачыма. У гэты раз мы адразу ў твары Кастуся Каліноўскага знайшлі многа супольнага з мастаком родам са Стаўрова.

Пасля мы зразумелі, што ў калгасе не было лепшай мадэлі. У час калі ўзнікалі славутыя карціны, шляхты і паноў, з якіх выводзіўся Каліноўскі, ужо не было на Пастаўшчыне. Калі і астаўся які недабітак, ён пайшоў у канспірацыю і прыкідваўся мужыком. Паводле афіцыйных савецкіх біяграфій, Пётра Сергіевіч нарадзіўся ў сям'і беззямельнай батрачкі. Але ў яго роднай вёсцы сказалі нам больш чым мы спадзяваліся. Між іншым пра тое, што мастак быў няшлюбным сынам шляхціча-памешчыка, пана Альфонса з недалёкіх Чарніц.

Кастусь Каліноўскі і Валеры Урублеўскі сярод паўстанцаў

(працяг будзе)

26.09 — 02.10

(22.03. — 20.04.) Знойдзеш больш часу для партнёра, што не значыць, што забудзеш пра кар'еру. Маеш шанц сустрэць кагосьці, з кім знаёмства акажацца быць асвяжаючым ды напоўніць цябе пазітыўнай энергіяй. Дзякуючы рашучасці здабудзеш усё, што хочаш.

(21.04. — 21.05.) Будзеш экспертам да вырашання сямейных канфліктаў. Маеш вялікі аўтарытэт, і выкарыстаўшы гэта далёка зойдзеш. Дасканалы момант на шуканне новай пасады.

(22.05. — 22.06.) Можа не ўдацца тое, што задумаў, а ўдасца непланаванае. Можа падвесці цябе сваячка і пачаць турбаваць здароўе бацькоў (пашукай добрага доктара, бо сучасная медыцына можа рабіць цуды). Шмат нерваў, але пры нагодзе навучышся спраўляцца з праблемамі.

(23.06. — 23.07.) Мноства энергіі; усё паафармляеш і зашпіліш на апошні гузік. Затое можа ахапіць цябе таксічнае каханне. Моцныя галаўныя болі могуць не быць мігрэнню, але калі не будуць мінаць, не бяры ўсё мацнейшых абязбольваючых таблетак (паспрабуй прымяніць акупунктуру).

(24.07. — 23.08.) Ад найменшай заўвагі будзеш проста кіпець. Засяродзішся на тым што адбываецца, а не на планах. Пасябруеш з суседзямі і зможаш на іх разлічваць. Адпачынь у ціхім месцы.

(24.08. — 23.09.) Усё ўбачыш свежым вокам, атачэнне будзе мілае і спрыяльнае. Хоць у найбліжэйшай сям'і могуць быць спрэчкі. А твой кашалёк таўсцее нейкім цудоўным спосабам! Не прымяняй таямнічых дыет ды не пі падазроных таблетак.

(24.09. — 23.10.) Ты цяпер пан сітуацыі. Добры час на змену іміджу, на старанні за лепшую пасаду. Квітнее кампанейскае жыццё. Сардэчныя сяброўскія кантакты, а хтосьці схоча перакрочыць межы і давесці, каб сяброўства стала раманам.

(24.10. — 22.11.) Варта аднавіць сямейныя кантакты. Пераканаешся, што ў цябе больш сяброў, чым ворагаў. Высветляцца адносіны з блізкімі (не старайся іх вырашаць з усяе сілы). Адкрыеш веды або здабудзеш інфармацыі, дзякуючы якім убачыш усё ў зусім іншым святле.

(23.11. — 22.12.) Будзеш захоплены памысным ходам хатніх спраў і суседскіх кантактаў. Удасца падарожжа. Старайся, калі яшчэ не апрацаваў дакладнага сцэнарыя, не скакаць у глыбокую ваду. Адзінокі Стралец пераканаецца, што прыгожае і ўзнёслае каханне трапляецца не толькі ў кніжках.

(23.12. — 20.01.) 26 — 30.09. прадбачваюцца клопаты ў пачуццёвым жыцці, крызіс, а нават расстанне. Не слухай плётак і давярай здароваму розуму. Сустракайся з людзьмі, у большай кампаніі, бо можаш многа чаго даведацца. Можаш развязаць шмат ключавых спраў, будзеш у змозе змяніць тое, што здавалася быць непарушным.

(21.01. — 19.02.) Будзеш пабуджаны да дзеяння, зрэалізуеш штосьці вельмі важнае. Пачне ладзіцца ў пары. Шыкуйся на імпрэзы, ды не пераборшчвай з алкаголем. Адчуеш, што зачынілася за табой эпоха; будзеш старэйшы, сталейшы, ды не будзе табе з гэтым кепска.

(20.02. — 21.03.) Фінансавыя справы вырашацца ў тваю карысць. Абмінай шырокай дугой людзей, якія хочуць толькі перад табой выгаварыцца. Не пазычай нікому грошай. Ад легкатраўнай ежы будзе табе лягчэй і на душы. Любое адчуванне дэжавю — сігнал аб небяспецы.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960